

# НАРАДА ПА ВІЦЕБШЧЫНЕ І МАНІТОРЫНГ ГАНДЛЮ

**Прэзідэнт заслухаў даклады Дзмітрыя Крутога і Наталлі Качанавай**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
23 КАСТРЫЧНІКА 2025 г. ЧАЦВЕР № 205 (30593)

# ЦІКАВАСЦЬ ДА БЕЛАРУСІ РАСЦЕ



**Экспарт турыстычных паслуг за 8 месяцаў года склаў 255 мільёнаў долараў**

СТАР. 8–9

БНТУ ПРЫМАЕ ФОРУМ ВНУ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

6



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X
25205>
9 771990 763008

ПЯЦІГОДКА ЯКАСЦІ

## КУРС НА АБНАЎЛЕННЕ

**У Беларусі папаўняюць парк грамадскага транспарту і ўкараняюць лічбавыя тэхналогіі**



Кіраўнік дзяржавы заўсёды ўдзяляў увагу якасці дарог і даступнасці пасажырскага транспарту, падкрэсліваючы, што жыхары як вялікіх гарадоў, так і вёсак павінны адчуваць сябе аднолькава камфортна. У чарговы раз звярнуўся да гэтай тэмы ён і падчас цырымоніі ўступлення на пасаду 25 сакавіка. *«Для гэтага трэба выраўноўваць магчымасці. Дзе б беларусы ні жылі — у вялікіх вёсках, аграгарадках, раённых цэнтрах — усюды ўмовы павінны быць, як у сталіцы. Якасныя дарогі, даступны транспарт — прыярытэт нумар адзін», — падкрэсліў тады Аляксандр Лукашэнка.* Як выконваецца задача Прэзідэнта?

СТАР. 11

# НАРАДА ПА ВІЦЕБШЧЫНЕ

## Прэзідэнт заслухаў даклады

***Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сераду заслухаў даклады кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрыя Крутога і Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталлі Качанавай, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.***

Галоўнай тэмай у дакладзе Дзмітрыя Крутога была падрыхтоўка вялікай нарады па забеспячэнні ўстойлівага развіцця Віцебскай вобласці, якая адбудзецца напрыканцы бягучага тыдня. Прэзідэнту быў дакладзены план будучай работы, галоўныя пункты якога — прадметныя справаздачы абласнога кіраўніцтва па асноўных кірунках.



Абмеркаваны таксама пытанні, якія патрабуюць пастаяннай увагі і кантролю. Размова аб сур'ёзных рашэннях, якія прымаліся па Віцебскай вобласці раней. Гэта работа інтэграцыйных структур і аграпрамысловага комплексу рэгіёна ў цэлым, работа прамысловага сектара і сітуацыя на праблемных прадпрыемствах, а галоўнае — праграма развіцця вобласці. Усе гэтыя кірункі знаходзяцца на асаблівым кантролі, і ў пятніцу на нарадзе па кожным з іх чакаецца асобная размова. Гэта падкрэсліў Аляксандр Лу-

### НАРАДА ПА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ БУДЗЕ МЕЦЬ КОМПЛЕКСНЫ ХАРАКТАР

**Аб некаторых падрабязнасцях даклада Дзмітрый Крутой расказаў журналістам**

Кіраўнік дзяржавы ўдзяляе асаблівую ўвагу сітуацыі ў рэгіёне, і на гэта ёсць шэраг прычын. Яшчэ ў час наведвання Полацка ў 2024 годзе, дзе праходзілі абласныя «Дажынкі», Прэзідэнт запатрабаваў ад кіраўніцтва Віцебскай вобласці дэталёва разабрацца з сітуацыяй у кожным з 21 раёна і выпрацаваць зразумелую, простую, даступную праграму развіцця кожнага раёна — своеасаблівую праграму адраджэння Віцебшчыны.

> **«З усім трэба вызначацца: якое поле, якая кармавая база для фермы ці комплексу. Але ўмовы павінны быць для людзей на гэтым комплексе або на ферме добрымі», — адзначыў тады кіраўнік дзяржавы. Ён пры гэтым падкрэсліў, што жыхары Віцебскай вобласці павінны бачыць перспектывы менавіта ў сваім рэгіёне: «Людзі павінны тут жыць і працаваць. Яны тут павінны знайсці сваё месца і сваю заробатную плату».**

Вясной гэтага года старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін прадставіў дакумент кіраўніку дзяржавы. Але, як аказалася, большасць мерапрыемстваў былі абсалютна не прапрацаваны. «Як Прэзідэнт ёмка адзначыў, гэта было фактычна пражэктарства. І ён адправіў гэтыя дакументы на дапрацоўку», — праінфармаваў Дзмітрый Крутой.

Практычна праз паўгода праект дапрацаванай праграмы будзе прадстаўлены зноў.

Акрамя таго, сярод асноўных тэм нарады — сітуацыя ў аграпрамысловым сектары Віцебскай вобласці, дзе некаторы час стваралія інтэграцыйныя структуры. Эфектыўнасць работы ў такім фармаце, а таксама перспектывы стануць прадметам дэталёвага абмеркавання.

Яшчэ адна вялікая тэма — падзеж жывёлы і меры, неабходныя для паляпшэння сітуацыі ў гэтай сферы не толькі ў маштабах Віцебскай вобласці, але і краіны ў цэлым.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта анансаваў, што нарада па Віцебскай вобласці будзе мець комплексны характар. «Тры такія вялікія блокі стануць прадметам абмеркавання на гэтай нарадзе. Мы запрасілі больш за 300 службовых асоб. Гэта фактычна ўвесь актыў Віцебскай вобласці. Кіраўнікі ключавых прадпрыемстваў, усё кіраўніцтва райвыканкамаў, ключавых падраздзяленняў Віцебскага аблвыканкама. Улічваючы, што гэтыя пытанні маюць значэнне ў маштабах усёй рэспублікі, будуць прадстаўлены дэлегацыі і з іншых абласцей нашай краіны», — заявіў Дзмітрый Крутой.






Фота БелТА.

### ПЕРШАЕ ПЫТАННЕ — ПРАГРАМА РАЗВІЦЦЯ ВІЦЕБШЧЫНЫ ДА 2030 ГОДА

«Як сёння адзначыў наш лідар, рэгіён хранічна не выконвае ўсе асноўныя параметры сацыяльна-эканамічнага развіцця, валавы рэгіянальны прадукт фактычна за пяцігодку Віцебшчына ні разу не выканала», — сказаў Дзмітрый Крутой. Узровень запасаў гатовай прадукцыі на складах застаецца адным з самых высокіх у краіне.

Ёсць праблемы і на асобных прадпрыемствах: «Белвест», «Віцебскдрэў», Полацкі малочны камбінат. Работнікі некаторых з іх нават накіроўвалі калектыўны зварот да Прэзідэнта з просьбай разабрацца, што там адбываецца. Выклікае непакой і сітуацыя на Аршанскім ільнокамбінаце, да якога далучылася Баранавіцкае ВБА ў рамках асобнага холдынгу.

«Пытанняў насамрэч па праграме развіцця Віцебшчыны вельмі-вельмі многа», — расказаў Дзмітрый Крутой.

***Сама праграма ўключае ў сябе некалькі блокаў, па кожным ёсць шэраг нюансаў і пытанняў для абмеркавання.***

Сярод іх — **якарныя праекты ў прамысловасці. У сельскай гаспадарцы — севазварот**, паколькі ў Віцебскай вобласці складаная кліматычная сітуацыя і няпростая сітуацыя з урадлівасцю глеб. У ліку гэтых пытанняў — **перспектывы ў раслінаводстве і жывёлагадоўлі** — тут важна вызначыцца, куды рухацца з улікам наяўных фінансавых рэсурсаў, працоўных рэсурсаў.

**Яшчэ адзін блок праграмы — турызм.** «Самі кіраўнікі вобласці анансавалі павелічэнне долі турыстычных паслуг у сваёй эканоміцы да 10 %. Гэта ў два разы фактычна вышэй за тую планку, якую Прэзідэнт даваў ураду ў рамках прыняцця рашэння па стварэнні асобнага агенцтва па развіцці турызму пры ўрадзе. На чым заснаваныя такія амбіцыйныя планы?» — абазначыў пытанне Дзмітрый Крутой.

**Наступны блок — лагістыка,** паколькі ў Віцебскай вобласці ёсць добры патэнцыял у выглядзе асаблівай эканамічнай зоны «Брэміна-Орша». Ёсць планы па развіцці аэрапорта Віцебска, рэканструкцыі, будаўніцтве некалькіх найважнейшых магістраляў, таму што Віцебшчына імкнецца стаць буйным чыгуначным кантэйнерным хабам.

«Гэта значыць, па кожным сегменце Віцебскай эканомікі ёсць пэўныя напрацоўкі, ёсць перспектывы. Але наколькі яны рэальныя і ўвязаныя з рэальным жыццём?» — задаецца пытаннем кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

### ВАЖНЫ БЛОК — АГРАПРАМЫСЛОВЫ КОМПЛЕКС

Недахопу ва ўвазе Віцебская вобласць ніколі не адчувала. Рэгіёну аказвалася ўсялякая падтрымка, рэалізоўваліся разнастайныя праекты. Яскравы прыклад — стварэнне інтэграцыйных структур у аграпрамысловым комплексе, што змяніла сітуацыю ў сельскай гаспадарцы рэгіёна. І з самага пачатку гэта пытанне — пад кантролем Прэзідэнта.

Яшчэ ў 2016 годзе па просьбе кіраўніцтва Віцебскай вобласці (на той момант яе ўзначальваў Мікалай Шарснёў) у рэгіёне былі створаны аграпрамысловыя інтэграцыйныя структуры. Быў падпісаны адпаведны ўказ кіраўніка дзяржавы. Гэта пытанне некалькі разоў абмяркоўвалася на ўзроўні Прэзідэнта, і ён выказваў вельмі сур'ёзныя асцярогі і сумненні, як, напрыклад, на вялікай нарадзе ў 2019 годзе.

«Я азнаёміўся з праектам указа, які вы нібыта калектыўна выпрацавалі і хочаце, каб я яго падтрымаў. Асноўныя прапановы прадугледжваюць (з пункту гледжання спецыялістаў) радыкальную перабудову ўсёй сістэмы кіравання агракомплексам вобласці», — адзначаў тады Аляксандр Лукашэнка. І ставіў шэраг пытанняў: «Пралічаныя фінансавыя патокі? Як будзе выбудавана сістэма кіравання? Размежаваны паўнамоцтвы і сферы адказнасці? Ці дазваляюць прапанаваныя меры канчаткова вырашыць праблемы ў Віцебскай вобласці ці гэта проста замаскіраваная чарговы раз дзяржаўная падтрымка, каб заплюшчыць вочы на парушэнне тэхналагічнай дысцыпліны і безгаспадарчасць?» Тады Прэзідэнт папярэджваў: адсядзецца нікому не атрымаецца, кожны будзе несці персанальную адказнасць за прынятыя рашэнні.

> **Такія рашэнні не могуць быць «глытком паветра», каб перачакаць, папярэджваў Прэзідэнт. «Калі вы дзеля гэтага робіце, то праз год гэтага паветра не будзе. Мяне ўсё ж такі турбуе, што будзе там, ці захаваецца сяло ў Віцебскай вобласці. Мяне як Прэзідэнта гэта цікавіць. І людзі. Гэта галоўнае. Гэта аснова», — канстатаваў Прэзідэнт на нарадзе ў 2019 годзе.**

За шэсць гадоў пазіцыя кіраўніка дзяржавы не змянілася. Як не змяніўся высокі градус яго ўвагі да аграпрамысловага комплексу Віцебшчыны.

Спачатку інтэграцыйных аб'яднанняў было чатыры, у 2020 годзе ў рамках вялікай карэкціроўкі гэтага ўказа іх стала сем. Сёння працуе шэсць. «Ёсць поўная раскладка эканамічных вынікаў, якіх яны дасягнулі. Нешта атрымалася, але ў цэлым у кіраўніка дзяржавы ёсць вялікая незадаволенасць ад вынікаў іх бягучай работы», — адзначыў Дзмітрый Крутой. Ён падкрэсліў, што ў 2020 годзе ў рамках рэарганізацыі, нягледзячы на складаныя абставіны таго перыяду, была аказана істотная падтрымка і выдзелена ўсё, што на той момант прасіла Віцебская вобласць. Як сустрэчныя абавязацельствы была распрацавана Праграма развіцця сельскай гаспадаркі Віцебскай вобласці да 2035 года, дзе былі распісаны аб'ёмы вытворчасці і перапрацоўкі прадукцыі па гадах. Выручка ад гэтага павінна была стаць асновай для пагашэння ўсіх даўгавых абавязацельстваў, адтэрмінаваных

# І МАНІТОРЫНГ ГАНДЛЮ

## Дзмітрыя Крутога і Наталлі Качанавай

кашэнка, заслухоўваючы даклад кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Другой тэмай даклада Дзмітрыя Крутога стала інфармацыйная работа. Яе рэгуляванне ўваходзіць у сферу адказнасці Адміністрацыі Прэзідэнта. Размова ў дакладзе ішла аб рабоце членаў урада і вышэйшых службовых асоб у СМІ. Гэта ўключае інфармаванне і тлумачальную работу па ключавых аспектах, якія ўваходзяць у кампетэнцыю міністэрстваў і ведамстваў, а таксама рэагаванне на хвалюючыя насельніцтва пытанні. Ключавое даручэнне кіраўніка дзяржавы — выбудоўванне інфармацыйнага балансу.

Акрамя таго, было даложана аб удасканаленні механізму камандзіравання службовых асоб за мяжу і арганізацыі рабочага працэсу з улікам патрабаванняў Дырэктывы нумар 11 — правядзенне нарад, калегій і іншых мерапрыемстваў у пазапрацоўны час, без адцягнення службовых асоб ад выканання іх прамых прафесійных абавязкаў.

і растэрмінаваных ў вельмі доўгім часавым цыкле. Аднак сёння прыкладна 30 % сельскагаспадарчых арганізацый, якія ўваходзяць у шэсць інтэграцыйных структур, працуюць са стратамі. Закрэдытаванасць ёсць і ў сферы перапрацоўкі, якая была вымушана авансаваць гэтыя сельгаспрадпрыемствы пад правядзенне сельскагаспадарчых работ.

«Гэты клубок праблем і даўгоў вельмі турбуе нашага лідара. Таму што той праект дакумента, які будзе выносіцца на нараду, па вялікім рахунку, прапануе ўжо трэці этап рэарганізацыі, калі мы замест аграпрамысловых аб'яднанняў створым два холдынгі па мясным і малочным кірунках. І зноў запытваецца дадатковы пакет дзяржаўнай падтрымкі, звязаны з чарговымі растэрміноўкамі, адтэрміноўкамі альбо са спісаннем штрафаў, рахункаў за энергетыку, за выкананыя гарантыі ўрада, і па шэрагу іншых кірункаў. Прэзідэнта, безумоўна, хвалюе пытанне, наколькі гэта абгрунтавана, і хто не выканаў папярэднія свае абавязацельствы. Вось у гэтым трэба будзе разабрацца на нарадзе», — расказаў Дзмітрый Крутой.

### НАСТУПНАЯ ТЭМА — ПАДЗЕЖ ЖЫВЁЛЫ

Тэма пастаянна ў полі зроку Прэзідэнта, за апошнія гады ёсць шэраг даручэнняў кіраўніка дзяржавы кардынальна пераламаць сітуацыю ў гэтай сферы. За гэтым пытаннем сочыць Генеральная пракуратура. «Разам з Камітэтам дзяржкантролю яны правялі вялікую працу для таго, каб паказаць аб'ектыўную карціну, што ўсё ж такі змянілася», — адзначыў Дзмітрый Крутой. Разам з тым назіраецца сур'ёзны ўхіл у бок пакаранняў, распачата шмат крымінальных спраў, шмат службовых асоб рознага ўзроўню прыцягнуты да адказнасці за гэты перыяд — усё гэта таксама выклікае пэўныя дысбалансы ў дадзенай сферы. І на гэта звярнуў увагу Прэзідэнт.

З іншага боку, праведзена вялікая работа на ўзроўні галіновых ведамстваў, Акадэміі навук па вызначэнні навукова абгрунтаваных паказчыкаў. Прэзідэнтам быў праведзены вялікі семінар, прысвечаны вырашэнню праблемы ўтрымання жывёлы. Важна праверыць, наколькі вынікі таго семінара ўвасоблены ў жыццё і выкарыстоўваюцца на практыцы на канкрэтных жывёлагадоўчых аб'ектах. «Падрыхтаваны таксама вялікі матэрыял, будзе шэраг дакладаў. І, я думаю, Прэзідэнт хоча прыняць комплексныя рашэнні, каб нарэшце разабрацца з гэтай праблемай», — удакладніў Дзмітрый Крутой.

***Акрамя падрыхтоўкі вялікай нарады па развіцці Віцебскай вобласці, у час даклада ўвага была засяроджана на такіх тэмах, як інфармацыйная работа, удасканаленне механізмаў камандзіравання за мяжу і арганізацыя рабочага працэсу з улікам патрабаванняў Дырэктывы нумар 11.***

### УЗМАЦНІЦЬ ІНФАРМАЦЫЙНУЮ РАБОТУ

Прэзідэнт цікавіўся, у прыватнасці, захаваннем так званага інфармацыйнага балансу паміж галінамі ўлады, вышэйшымі службовымі асобамі, органамі ўлады, міністрамі. «Наколькі мы актуальна і надзённа адчуваем праблематыку і тыя пытанні, якія павінны даводзіць да насельніцтва і растлумачваць насельніцтву. Наколькі дзяржорганы актыўна займаюцца гэтай работай і кантралююць гэтыя працэсы», — растлумачыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

«Прэзідэнт сказаў, што ёсць асобныя ўдалыя прыклады», — дадаў ён. У якасці прыкладу названа сумесная работа КДК з тэлеканаламі і друкаванымі СМІ, іх рубрыка «На кантролі Прэзідэнта», калі рэзанансныя, значныя выпадкі эканамічнага, сацыяльнага парадку журналісты паслядоўна адсочваюць і даводзяць да канца, кантралююць са свайго боку.

Дзмітрый Крутой лічыць таксама пазітыўным прыклад асвятлення на тэлеканалах і ў іншых СМІ праблем арганізацыі гандлю ў сельскай мясцовасці. «Журналісты, многія працэсы суправаджаючы, падганяюць нашых чыноўнікаў, і ёсць добры водгук ад грамадзян», — сказаў ён.

Паводле даных Адміністрацыі Прэзідэнта, працяглы час топ-3 тэм, з якімі звяртаюцца грамадзяне, практычна не мяняецца. Гэта ЖКГ, цэны, медыцынскія паслугі. «Прэзідэнт сказаў сёння, што вось гэтых міністраў фактычна не бачна на экранах, яны ніякім чынам не выступаюць, няма добрых тэматычных сюжэтаў, прысвечаных гэтым праблемам. А з'яўляцца толькі ў рамках выніковых або прамежкавых калегій — гэта не інфармацыйная работа з боку нашых галіновых ведамстваў», — праінфармаваў Дзмітрый Крутой.

Ён нагадаў, што ў службовых асоб, парламентарыяў, кіраўнікоў на месцах ёсць свае сферы адказнасці ў частцы вядзення інфармацыйнай работы. Напрыклад, за эканоміку адказвае прэм'ер-міністр, за кантрольную дзейнасць — генеральны пракурор і КДК, палаты парламента — за работу з мясцовымі органамі ўлады і гэтак далей. «Прэзідэнт сказаў гэту інфармацыйную работу па блоках значна ўзмацніць. Ну а мы ў Адміністрацыі Прэзідэнта пастараемся з дапамогай СМІ каардынаваць усе гэтыя працэсы», — падкрэсліў Дзмітрый Крутой. Ён звярнуў увагу, што многія аспекты ідэалагічнай, інфармацыйнай работы ўсёй вертыкалі адлюстраваны ў нядаўна прынятай Дырэктыве нумар 12.

### НЕ ТУРЫСТЫЧНЫЯ ПАЕЗДКІ, А РЭАЛЬНЫ ЭФЕКТ

Важнай тэмай даклада Прэзідэнту стаў нядаўна падпісаны ўказ па ўдасканаленні камандзіравання службовых асоб за мяжу.

Дзмітрый Крутой нагадаў пасыл Прэзідэнта аб тым, што гэта не павінны быць турыстычныя паездкі, а любая камандзіроўка павінна суправаджацца эканамічным і інвестыцыйным эфектам. На ўзроўні МЗС і ўрада сёння падрыхтаваны памяткі фактычна па кожнай краіне. І цяпер кожная службовая асоба атрымлівае заданні на камандзіроўку па эканамічнай, гандлёвай і інвестыцыйнай павестцы. «Прэзідэнт цікавіўся, ці ёсць нейкі эфект. З улікам таго, што ён сам падпісаў камандзіраванне шэрагу асоб, у прыватнасці ў краіны Афрыкі і ў Азію, ён абавязкова папрасіў узмацніць гэтую работу і трымаць яе на кантролі», — адзначыў Дзмітрый Крутой.

Наступная тэма даклада, паводле яго слоў, гэта «правядзенне шматлікіх нарад, якія ў адпаведнасці з Дырэктывай нумар 11 павінны перанесці з працоўнага часу на выхадныя дні або пасля работы». Па словах Дзмітрыя Крутога, гэты працэс у апошні час стаў актыўна трансфармавацца. «Абсалютна ўсе службовыя асобы папярэджаны аб персанальнай адказнасці за адцягненне міністраў па няпрофільных мерапрыемствах. І перанос усіх нарад, калегій, выканкамаў павінен адбыцца менавіта на выхадныя дні, для таго, каб у рабочы час не адцягвацца ад сваіх прамых прафесійных абавязкаў», — дадаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.



Асноўнай тэмай даклада Наталлі Качанавай кіраўніку дзяржавы стаў маніторынг сферы гандлю на месцах і працэсаў цэнаўтварэння. Па даручэнні Прэзідэнта такі маніторынг ажыццяўляюць Савет Рэспублікі і Палата прадстаўнікоў. Кіраўнікі палат парламента рэгулярна дакладваюць кіраўніку дзяржавы актуальны зрэз інфармацыі па гэтых тэмах. У прыватнасці, раз на месяц справаздачу аб выніках маніторынгу Прэзідэнту накіроўвае Палата прадстаўнікоў. На гэтых жа пытаннях была сканцэнтравана ўвага і падчас даклада Старшыні Савета Рэспублікі: справядлівасць у пытаннях цэнаўтварэння, арганізацыя гандлю ў рэгіёнах і сельскай мясцовасці, настрой ў грамадстве ў цэлым і праблемныя пытанні, якія хвалююць насельніцтва.

Акрамя таго, Наталля Качанава далажыла кіраўніку дзяржавы блок кадравых пытанняў, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Савета Рэспублікі.

### У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — РЭГІЯНАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА

**Як адзначыла ў размове з журналістамі спікер, Аляксандр Лукашэнка заўсёды трапятліва адносіцца да пытанняў рэгіянальнага развіцця нашай краіны.**

У гэтай рабоце, па словах спікера, асаблівая ўвага ўдзяляецца кадравай палітыцы. «Законы аднолькавыя, умовы эканамічныя аднолькавыя — сітуацыя складваецца па-рознаму, — канстатавала яна. — Прэзідэнт падрабязна распытаў аб тым, як сёння працуюць кадры на месцах, якія сенатары бачаць пытанні ў кадравай палітыцы, наколькі эфектыўна вырашаюцца звароты, што паступаюць да членаў Савета Рэспублікі. Гэта характарызуе эфектыўную работу кадраў на месцах».

Наталля Качанава падрабязна далажыла Прэзідэнту аб тым, як вырашаюцца гэтыя пытанні. «Як ажыццяўляецца падбор кадраў, як замацоўваюцца маладыя спецыялісты, якія прыязджаюць працаваць у рэгіёны, як сёння працуюць тыя кіраўнікі, якія займаюць адказныя пасады: такія, як старшыня гарвыканкама, старшыня раённага выканкама, нашы калегі-дэпутаты», — канкрэтызавала спікер.

Члены Савета Рэспублікі працягваюць ажыццяўляць маніторынг функцыянавання гандлёвых аб'ектаў ва ўсіх рэгіёнах краіны. Аб гэтым таксама ішла размова падчас дакладу Прэзідэнту. «Маніторынгам ахоплена каля 700 гандлёвых аб'ектаў, 116 з іх — у сельскай мясцовасці, — праінфармавала Наталля Качанава. — Перш за ўсё мы робім акцэнт на наяўнасці гандлёвых аб'ектаў. Калі такіх няма, то гэта павінны быць аўтакрамы, і людзі павінны мець магчымасць набыць якасны тавар у любым рэгіёне нашай краіны».

Другое, не менш важнае пытанне, на якое падчас маніторынгу звяртаюць увагу сенатары, — цэнаўтварэнне. «Задача, пастаўленая кіраўніком дзяржавы, — справядлівая цана: людзі павінны набываць тавар не па завышаных цэнах, — удакладніла спікер. — І асартыментны пералік, што вельмі важна. Вядома, мы звяртаем увагу на наяўнасць беларускіх тавараў у нашых крамах. Недапушчальна, калі, маючы столькі прадпрыемстваў, якія выпускаюць свае добрыя, якасныя прадукты харчавання, тавары народнага спажывання, часам мы не бачым іх у нашых крамах. Таму адбыўся падрабязны даклад па пытаннях гандлёвага забеспячэння ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны».



Валерыя СЦЯЦКО, Вераніка КАНЮТА.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Минский домостроительный комбинат», 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 43 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

| № лота | Предмет электронных торгов | Начальная цен лота, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Квартира**, инв. № 500/D-7988236246, общ. пл. 91,9 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-71 | 322 110,00 |
| 2 | **Машино-место**, инв. № 500/D-7988227728, общ. пл. 13,7 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-26 | 16 020,00 с НДС |
| 3 | **Машино-место,** инв. № 500/D-7988227729, общ. пл. 13,6 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-27 | 16 020,00 с НДС |
| 4 | **Машино-место,** инв. № 500/D-7988227730, общ. пл. 13,3 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-35 | 16 020,00 с НДС |
| 5 | **Машино-место,** инв. № 500/D-7988227731, общ. пл. 13,5 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-36 | 16 020,00 с НДС |

**Задаток** (1 % от начальной цены лота № 1, 5 % от начальной цены лотов №№ 2–5) в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 3 (три) рабочих дня** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 6 (шесть) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи

В случае несвоевременной оплаты предмета электронных торгов согласно договору купли-продажи Покупатель уплачивает пеню в размере 0,2 % от суммы неисполненных обязательств (невыплаченной суммы) по договору за каждый день просрочки платежа

В случае расторжения договора купли-продажи по инициативе Покупателя Покупатель уплачивает Продавцу неустойку (штраф) в размере 15 000 белорусских рублей

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и установленное вознаграждение **1 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 10.10.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов. 03.11.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 31.10.2025 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
**(организатор аукциона)**
**по поручению открытого акционерного общества «Краснодворцы» (продавец)**
**проводит открытый аукцион**
**по продаже недвижимого имущества:**

**Лот № 1: здание бани с инвентарным номером 644/С-53302**
**площадью 180,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625085402601000351 (право аренды по 17.11.2034) площадью 0,0617 га по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, аг. Жабин, ул. Юбилейная, 8А.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **33 696,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **3 369,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 20 %.**

**Лот № 2: здание комплексного приемного пункта с инвентарным номером 644/С-34045**
(составные части и принадлежности: уборная, сарай)
**площадью 146,1 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625085409301000280 (право постоянного пользования) площадью 0,2083 га по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, д. Погост-1, ул. Зиновьева, 45А.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **25 824,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **2 582,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 20 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 07.06.2025, 16.09.2025.

Аукцион состоится **04.11.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **31.10.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра (8029) 114-85-48.**

УНП 600071008

# ЗДЗЯЙСНЕННІ НА КАРЫСЦЬ БЕЛАРУСІ

## Аляксандр ТУРЧЫН уручыў дзяржаўныя ўзнагароды

У Палацы Рэспублікі сабраліся найлепшыя прадстаўнікі працоўных калектываў краіны. Па даручэнні Прэзідэнта Беларусі Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын уручыў ім дзяржаўныя ўзнагароды, якія з'яўляюцца знакам прызнання заслуг і адданасці справе. Сярод узнагароджаных — прадстаўнікі падатковых органаў, прамысловасці, лясной гаспадаркі, аграпрамысловага комплексу, будаўнічай сферы, культуры, спорту, дзяржаўныя служачыя.



### ПОСПЕХ — У СУМЛЕННАЙ, КАРПАТЛІВАЙ І САМААДДАНАЙ ПРАЦЫ

«Сваім прыкладам вы даказваеце, што працавітасць, прафесіяналізм, адказны падыход і неабыякавасць заўсёды прыводзяць да высокіх вынікаў, — падкрэсліў Аляксандр Турчын. — Усё гэта ўмацоўвае аўтарытэт дзяржавы, павышае ўзровень яе дабрабыту і ў выніку мяняе да лепшага жыццё нашых грамадзян. Менавіта ў штодзённай сумленнай, карпатлівай і самаадданай працы — поспех любой справы».

Звяртаючыся да ўзнагароджаных медалём «За адзнаку ў папярэджанні і ліквідацыі надзвычайных сітуацый», кіраўнік урада акцэнтаваў увагу, што яны сваёй працай захавалі сапраўды нацыянальны здабытак — нашы ўнікальныя лясы.

«Ад імя ўрада і ад сябе асабіста віншую вас з гэтай знамянальнай падзеяй у вашым жыцці, — дадаў Аляксандр Турчын. — Няхай гэта ўзнагарода натхняе вас на новыя здзяйсненні на карысць роднай Беларусі, а вы будзеце для іншых прыкладам таго, як трэба шчыра любіць сваю краіну, рабіць усё для яе развіцця і росквіту. Немалая частка вашага поспеху — гэта цярпенне, падтрымка і дапамога вашых родных і блізкіх, сяброў і працоўных калектываў. Вялікая ўдзячнасць ім за гэта».

Прэм'ер-міністр пажадаў удзельнікам урачыстай цырымоніі моцнага здароўя, дабрабыту, новых прафесійных вышынь, а затым уручыў заслужаныя ўзнагароды.

### НЕ ТОЛЬКІ ПРЫЗНАННЕ ЗАСЛУГ, АЛЕ І МАТЫВАЦЫЯ

Сярод узнагароджаных медалём «За працоўныя заслугі» — **рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Вадзім БОГУШ.** «Высокая ацэнка, дадзеная Прэзідэнтам, успрымаецца як узнагарода, якая ўручана не асабіста мне, а вялікаму калектыву, — удакладніў ён. — Калектыву, які працуе разам са мной, тым, хто падтрымлівае мяне дома. Без сям'і, калег дасягаць высокіх вынікаў проста немагчыма. Узнагарода ўспрымаецца і як задача на будучыню: дзяржаўныя ўзнагароды — гэта ў тым ліку яшчэ і матывацыя да далейшай эфектыўнай работы, каб вынікі, якіх мы дасягаем разам, прыносілі толькі карысць нашай суверэннай роднай Беларусі».

Па словах **начальніка жывёлагадоўчай фермы «Капцёўка» камунальнага вытворчага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Гродзенская птушкафабрыка» Фелікса ЮРОЎСКАГА**, уручэнне яму медаля «За працоўныя заслугі» стала нечаканасцю. Усё жыццё прысвяціў сельскай гаспадарцы. Ужо на заслужаным адпачынку, але адысці ад аграрных спраў не можа. У сельскай гаспадарцы Фелікс Станіслававіч — 45 гадоў.

«На ферме сярэднясутачная прывага — больш за кілаграм, высокія надоі, — гаворыць кавалер медаля аб працоўных поспехах. — Сваімі сіламі добраўпарадкавалі ферму, створаны ўсе ўмовы для камфортнай працы людзей, утрымання жывёл. Раней працаваць у сельскай гаспадарцы было вельмі складана. Цяпер мяняюцца тэхналогіі, таму працаваць стала лягчэй, не так напружана, як гэта было».

За шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, значны асабісты ўклад у развіццё газавай галіны Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена **намесніку начальніка вытворча-тэхнічнага аддзела філіяла «Баранавіцкае вытворчае ўпраўленне» РУП «Брэстаблгаз» Уладзіславу БАРТКЕВІЧУ**.

«Узнагарода — гэта адзнака не толькі маёй працы, але і ўсіх газавікоў Брэстчыны, у прыватнасці Баранавіцкага раёна, — лічыць ён. — Разам з тым гэта накладвае і пэўныя абавязкі ў будучыні: яшчэ лепш выконваць задачы, якія ставіць перад намі дзяржава ў частцы абслугоўвання насельніцтва, развіцця газавай галіны. Будзем імкнуцца!»

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

ПА СУТНАСЦІ

# АСНОВА ДАБРАБЫТУ



Палітычная палеміка, высокія словы аб гуманізме, павучальны тон прадстаўнікоў «высакамерных цывілізацый» — сціхае ўсё, калі трапляеш у «клас пад адкрытым небам», што размешчаны на Гомельшчыне. Тут замест утульных партаў — каменныя і халодныя. Тут стыне кроў і шчыміць сэрца, бо менавіта тут, у Чырвоным Беразе, заморскія цмокі адбіралі кроў у нашых дзяцей. Да апошняй кроплі. Зрэшты, колькі такіх «класаў» раскідана па ўсім свеце. Месцаў, дзе адны народы і дзяржавы «абагачаліся» за кошт іншых. Беларусаў у гэтым не папракнеш. Ніколі. Карміліся, кормімся і карміцца будзем са сваёй збажыны.

Мы ніколі не распачыналі войны ды спрэчкі, але ўдзельнічаць павінны былі, бо тэрыторыя наша заўжды ў напрамку галоўнага ўдару. І цяпер мы паняволі ўдзельнікі эканамічнай вайны. А як інакш можна назваць тыя наўмысныя санкцыі супраць беларускай прамысловасці? Нашы прадпрыемствы экспартаарыентаваныя, а значыць, канкурэнты для аналагічных замежных вытворчасцяў. Таму пры любым зручным моманце нашых вытворцаў імкнуцца прыбраць з дыстанцыі, адзін з элементаў несумленнай і незаконнай барацьбы — санкцыі, і так паступаюць усю дарогу нашага суверэннага шляху. Аднак мы рухаемся наперад. Можа, не заўсёды з жаданай хуткасцю, але нам патрэбна эканоміка новых хуткасцяў. Каб жыць лепш, трэба лепш працаваць.

Мы адкрываем цэнтры духоўнага станаўлення, робім патрыятызм модным. Але галоўны барометр настрою ў сучасным грамадстве спажывання — эканамічныя паказчыкі. Вось яскравыя прыклады. Моладзь Непала, у якой прыкметай забяспечанасці была наяўнасць гаджэтаў, і польскія паны, забяспечанасць якіх беларусам варожыя цэнтры кіравання «прадаюць» як узорную — усе незадаволеныя сваім становішчам. Пакаленне Z-спажыўцоў у Непале — адной з найбяднейшых краін свету — знесла ўрад за некалькі дзён. Амаль палова насельніцтва Польшчы супраць урада Туска. Ну, яшчэ некалькі непапулярных і бессэнсоўных крокаў, накшталт закрыцця мяжы з Беларуссю, і антырэкорд народнай «любові» пану Туску гарантаваны. Такія розныя краіны, з розным дабрабытам, узроўнем развіцця, у розных частках свету, а прычына грамадскай незадаволенасці — адна. Прычым і Непал, і Польшча — рэлігійныя дзяржавы. У сталіцы Непала — Катманду — лабірынты старога квартала, дзе ёсць мноства індуісцкіх і будыйскіх святыняў. У Польшчы няма вёскі без касцёла. Але цяпер сучасная «рэлігія», якую ўзрошчваў калектыўны Захад, — сытае чэрава, новы айфон і білет на заморскі бераг.

У нас інакш. Тым не менш эканоміка — аснова. Гэта ўвесь час нагадвае Першы. А ў Беларусі яна мабілізацыйная, бо адкрытая: 80-85 % выробленага мы павінны прадаць. Прычым цяпер адбываецца перадзел сусветнай эканомікі. Бітва за месца ў планетарным рэйтынгу эка-

# ВОПЫТ, ВАРТЫ ПЕРАЙМАННЯ




## Як ініцыятыву «ад двара» хутка рэалізаваць на ўзроўні горада

Размова аб вопыце сталіцы па рабоце акруговых саветаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання ішла на выязным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі. Літаральна за год — з ліпеня 2024 года — у Мінску сіламі акруговых саветаў было вырашана 5606 пытанняў. З іх большасць — 4509 — у сферы ЖКГ, 167 — у галіне сацыяльнай абароны, 107 — пытанні гандлю і паслуг, 74 — са сферы будаўніцтва, 72 — сістэмы адукацыі, 33 — датычыліся аховы здароўя, 640 пытанняў з іншых сфер.

Пры дапамозе акруговых саветаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (ТГС) грамадзяне ажыццяўляюць самакіраванне па месцы жыхарства: на частцы тэрыторыі, такой як мікрараён, квартал, вуліца, двор або пад'езд. Перад кожным саветам ТГС (а іх у сталіцы функцыянуе 60, што адпавядае колькасці выбарчых акруг) стаіць шмат задач, якія выконваюцца на належным узроўні.

**Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў г. Мінску Наталля КАЧАНАВА** прывяла ў прыклад лічбы і той факт, што колькасць зваротаў грамадзян па асабістых пытаннях у Савет Рэспублікі зменшылася на 24 %: «Ніколі такога не было ў гісторыі горада Мінска. Горад Мінск — самая вялікая тэрытарыяльная адзінка ў плане колькасці насельніцтва. Тут заўсёды было дастаткова шмат зваротаў. Затое ў КОТГСы сёння паступае да 350 зваротаў штомесяц. Вынік у гэтай работы ёсць».

У ходзе пасяджэння сталічны дэпутацкі корпус падзяліўся вопытам работы з насельніцтвам шляхам стварэння, можна сказаць, вертыкалі: ініцыятыва «ад двара» хутка рэалізуецца на ўзроўні горада. Акрамя таго, расказалі аб новых напрацоўках, звязаных з арганізацыяй і правядзеннем акцый па добраўпарадкаванні.

**Старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Арцём ЦУРАН** адзначыў актыўны водгук насельніцтва ў частцы навядзення парадку, мінчане ахвотна ўдзельнічаюць у рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў. Што датычыцца 2025 года, ужо падведзены пэўныя вынікі: 400 тысяч рублёў з бюджэту было выдаткавана на рэалізацыю грамадзянскіх ініцыятыў, 43 тысячы — тое, што ўнеслі ініцыятары і іншыя неабыякавыя гараджане, каля 1 млн рублёў былі накіраваны службамі ЖКГ і адміністрацыямі раёнаў для навядзення парадку на тэрыторыях вакол грамадзянскіх ініцыятыў — такі комплексны працэс. «Асноўныя сродкі і намаганні горада і ў Год добраўпарадкавання, і ў наступныя гады будуць накіраваны на тое, каб двары, зялёныя зоны, прылеглыя да дома, дзіцячыя пляцоўкі, спартыўнае сучаснае абсталяванне выглядалі годна. Гэтым вопытам і падзяліліся з калегамі».

Дарэчы, у мерапрыемстве ўзялі ўдзел старшыні Віцебскага, Гомельскага, Гродзенскага і Мінскага абласных Саветаў дэпутатаў, гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў, дэпутаты Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў.

**Яна ВАЛАСАЧ.**

### Даслоўна

Як расказала **член Савета Рэспублікі, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ,** дэпутацкі корпус Мінскай вобласці актыўна ўдзельнічае ў добраўпарадкаванні. «Выбудавана канструктыўнае ўзаемадзеянне з нашымі дарожнымі службамі, прадстаўнікамі лесагаспадарчых аб'яднанняў і не толькі».

Адна з форм работы для паляпшэння ўмоў пражывання грамадзян, укаранёная ў Мінскай вобласці, — агляд-конкурс на найлепшае добраўпарадкаванне і ўтрыманне сельскіх населеных пунктаў. Асноўная яго задача — прывесці ў парадак аграгарадкі. «Грашовыя сродкі, якія атрымае пераможца, па задуме размяркоўваюцца так: 70 % — на добраўпарадкаванне наступнага аграгарадка, 30 % — на тое, каб далей працягнуць развіццё тых аграгарадка і вёскі, якія перамаглі», — дадала яна.

Акрамя таго, па словах Наталлі Якубіцкай, эфектыўна прайшоў дэпутацкі суботнік, ідэю якога падтрымаў старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксей Кушнарэнка: «У ім бралі ўдзел і пажылыя людзі, і моладзь. Мерапрыемства аказалася рэзультатыўным».

намічнага дабрабыту. А над намі ціснуць санкцыі, а на найбліжэйшым і самым даступным рынку — расійскім — зразумелыя складанасці. Беларусы пакутаваць ад гэтага не павінны. Прастора для супрацоўніцтва неверагодна вялікая. Стварыць новыя тавары, асвойваць кампетэнцыі. Мы шукаем кампаньёнаў па ўсім свеце.

Цяпер дыктатура калектыўнага Захаду разбураецца на вачах. Але ёсць небяспека, каб на гэтых абломках не вырас новы квазі-глабальны цэнтр, у цісках якога апынецца сусветная эканоміка і нацыянальныя эканомікі мноства дзяржаў. Таму неабходна развіваць рэгіянальныя інтэграцыі з глабальным уплывам. Прэзідэнт прапанаваў новае прачытанне ўжо звыклай абрэвіятуры СНД, наладжвае новыя шляхі ў краіны далёкай дугі. Непарушны дыялог з Расіяй. Але і з Трампам трэба размаўляць. Гэтыя перагаворы — аб канкрэтнай выгаднай здзелцы для нас. Прэзідэнт, што называецца, напружвае ўнутраныя рэзервы. Сам асабіста і па знешнім контуры стварыў цэлую вертыкаль супрацоўніцтва. Традыцыйна — Расія і Кітай, краіны ЕАЭС, а таксама — дзяржавы постсавецкай прасторы, далёкая дуга.

Магчымасці беларускай эканомікі — гэта задзел з мінулага, традыцыйныя галіны гаспадарання, кампетэнцыі, якія былі асвоены раней, з упорам на прыродны ландшафт, кліматычныя асаблівасці, геаграфічнае становішча дзяржавы. І пры Вітаўце, і пры Машэраве беларусы вырошчвалі хлеб. Тэхналогіі, навука, прамысловасць — савецкая спадчына. І ў гэтым прасочваецца пераемнасць. Развіваецца прыватная ініцыятыва, фермерства. Спакойна, па-беларуску. «Галапіруючае» развіццё прыватнага бізнесу прывяло б да рэзкага падзелу грамадства. Быць багатым не сорамна, у Беларусі сорамна пышыцца гэтым. Менавіта ў нас працуе гэта залатое сячэнне забяспечанасці, гэта ўнікальны здабытак краіны. Эксперты могуць казаць рознае і крытыкаваць нас, але любая змена структурнасці нацыянальнай эканомікі прывядзе да пераразмеркавання выгод, а ў выніку — да несправядлівасці. Таму працаваць нам менавіта ў такой эканамічнай парадыгме. Кіраўнічай воляй Аляксандра Лукашэнкі пункты апоры былі захаваны. Ізноў жа рашэннем Прэзідэнта атрымала развіццё IT. Цяпер кіраўнік дзяржавы займаецца індустрыялізацыяй новага тэхналагічнага ўкладу. Стварэнне і наведванне тэхнапаркаў для дзяцей не што іншае, як фарміраванне айчынных, уласных кампетэнцый, а значыць, тэхналагічнай замоўнасці і суверэнітэту. Вось так выглядаюць інвестыцыі ў будучыню. І бацькоўскі патранаж моладзі.

Рост даходаў — гэта ці не самая яркая прыкмета сацыяльнай дзяржавы. Плаціць больш пры любой магчымасці. А магчымасці цяпер скаваныя. Не дапрацоўваем, рэзюмуе Першы. Дзецям хочацца гарадскіх Цэнтраў тэхнічнай творчасці, людзям у паважаным узросце — каб не закрывалі ФАПы і аддзяленні ў райбальніцах, вадзіцелям — добрых дарог, сямейным парам — больш паркаў, жанчынам — мацярынскага капіталу за другое дзіцятка.

У нас няма сотняў дывізій і неверагодных запасаў у нетрах. Затое наша тэрыторыя — гэта прыгранічча цывілізацый. Заўсёды на стыку інтарэсаў. Наша з вамі поле бою — вось яно, зусім блізка для кожнага. Станок, руль, пісьмовы стол, інструмент...

Экспартны беларускі партфель. Гэта харчаванне і тэхніка. З харчаваннем лягчэй. Запыт на такую прадукцыю ў свеце будзе толькі расці. Гэту нішу нельга страціць, бо яна самая беларуская, бо мы — цывілізацыя хлеба. Па нашых палетках шчыруюць трактары, а не гойсаюць танкі.

Выніковасць эканомікі пачынаецца, што называецца, у палях, на працоўных месцах, яна дапамагае нам не ператварыць краіну ў поле бою для розных цэнтраў сіл. Зразумела, надвор'е, карэктывы... Працаваць трэба. Вось і ўвесь спрадвечны алгарытм. Шлях да беларускага дабрабыту ляжыць менавіта праз гэта.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

PARITETBANK
ТВОЙ И ЦИФРОВОЙ

**Открытое акционерное общество «Паритетбанк»**
(Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Киселёва, 61а)

**сообщает, что 06 ноября 2025 г.**
***в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Паритетбанк»***
**состоится внеочередное Общее собрание акционеров ОАО «Паритетбанк» в заочной форме по адресу: г. Минск, ул. Киселёва, 61а**

**Повестка дня**
1. О внесении изменений в Устав ОАО «Паритетбанк».
2. Об утверждении изменений и дополнений № 3 в Положение о Наблюдательном совете ОАО «Паритетбанк».
3. Об утверждении изменений и дополнений № 2 в Положение о Ревизионной комиссии ОАО «Паритетбанк».
4. Об утверждении Дивидендной политики ОАО «Паритетбанк».
5. Об утверждении, создании и порядке использования резервного фонда заработной платы.
6. О компенсации расходов членам Наблюдательного совета ОАО «Паритетбанк».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров ОАО «Паритетбанк», составляется на основании реестра акционеров, сформированного по состоянию на 23 октября 2025 г.

Регистрация лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров ОАО «Паритетбанк», будет проводиться при получении бюллетеней при предъявлении документов, удостоверяющих личность (подтверждающих их полномочия).

Получить бюллетень для заочного голосования и информацию (документы) к внеочередному Общему собранию акционеров ОАО «Паритетбанк» лица, имеющие право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров ОАО «Паритетбанк», могут по месту проведения внеочередного Общего собрания акционеров ОАО «Паритетбанк» (нахождения ОАО «Паритетбанк») 23–27 октября 2025 г. с 09.00 до 16.00 часов.

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть представлены по месту проведения внеочередного Общего собрания акционеров ОАО «Паритетбанк» (нахождения ОАО «Паритетбанк») по адресу: 220002, г. Минск, ул. Киселёва, 61а – не позднее 03 ноября 2025 г.

**Телефон для справок: +37517 311 45 37.**

*Наблюдательный совет ОАО «Паритетбанк».*

**https://www.paritetbank.by**

ОАО «Паритетбанк». УНП 100233809.
Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 13 февраля 2024 года № 5.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(Организатор аукциона)* по поручению
**ОАО «РСУ «Мясомолоко» г. Слуцк»** *(Продавец)*
проводит открытый аукцион

**ПО ПРОДАЖЕ БЫТОВОЙ ПРИСТРОЙКИ ЦЕНТРАЛЬНОГО ТЕПЛОВОГО ПУНКТА с инв. № 640/С-93945**
**общ. пл. 162,5 кв. м, расположенной на земельном участке с кадастровым номером 624650100001007092 пл. 0,0377 га по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Молодежная, 8А.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **25 002,94** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **2 500,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 40 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 17.07.2024, 25.10.2024, 06.02.2025, 26.06.2025.

Аукцион состоится **05.11.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.11.2025** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17, 516-80-64.**
**Тел. для осмотра (8044) 555-58-50.**
УНП 600154328

**25.11.2025 года в 09.00** на электронной торговой площадке «Единая система электронных торгов» torgi.gov.by состоится аукцион № 27166 по продаже следующего объекта:

- **магазин** по адресу: г. Гродно, ул. Грандичская, 30;
- **сигнализация охранная**, инвентарный номер ГР0000075;
- **сигнализация пожарная**, инвентарный номер 00000044;
- **котел**, инвентарный номер 00000264.

Начальная цена – 350 000 рублей с учетом НДС,
задаток – 35 000 рублей.
Собственник имущества –
**Гродненское областное потребительское общество.**

**Контактный телефон 8 0152 392942.**
УНП 590959404

# АВІЯЦЫЯ, МАШЫНАБУДАВАННЕ, АТАМНАЯ ЭНЕРГЕТЫКА І КОСМАС

## У Мінску стартаваў XIV Форум ВНУ інжынерна-тэхналагічнага профілю Саюзнай дзяржавы

**Да 25 кастрычніка ўключна Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт будзе эпіцэнтрам маштабнай падзеі — тут праходзіць XIV Форум ВНУ інжынерна-тэхналагічнага профілю Саюзнай дзяржавы. Мерапрыемства сабрала звыш тысячы навукоўцаў, спецыялістаў, студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў з больш чым 40 ВНУ Беларусі, Расіі, Узбекістана і іншых краін.**

Сёлета асноўная канцэпцыя форуму, які праводзіцца з 2012 года, прысвечана прыярытэтным кірункам навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці ВНУ Саюзнай дзяржавы, развіццю інжынернай адукацыі ў Саюзнай дзяржаве і маладзёжнага інавацыйнага прадпрымальніцтва, а таксама патрыятычнаму выхаванню ў інжынернай адукацыі Саюзнай дзяржавы.

«Унікальнасць форуму ў тым, што падобнай падзеі сярод інжынерных ВНУ няма нідзе ў свеце, — адзначыў падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця **намеснік Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Аляксей КУБРЫН**. — Ёсць падпісаныя пагадненні паміж асобнымі ВНУ, працягваюцца абмены інфармацыяй, тэхналогіямі, методыкамі навучання. Але такой маштабнай падзеі няма. Асаблівасць нашага форуму яшчэ і ў тым, што цікавасць да яго за ўсе гады, якія ён праводзіцца, не падае, а, наадварот, павялічваецца».



Аляксей Кубрын падкрэсліў, што сёння інжынерныя спецыяльнасці ставяцца ў аснову. «Мы прыйшлі ўжо да практычнага вырашэння той задачы, якая пастаўлена двума прэзідэнтамі, — аб павышэнні прэстыжу інжынерных прафесій і павышэнні якасці спецыялістаў, якія выпускаюцца. Таму што мы павінны забяспечыць самы высокі ўзровень якасці прадукцыі і самыя высокія тэхналогіі», — сказаў ён.

Сярод актуальных праектаў у інжынерным кірунку намеснік дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы вылучыў у першую чаргу авіяцыйную галіну: «Задача пастаўлена Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам — ствараць авіяцыйную галіну ў Беларусі. Значыць, неабходна рыхтаваць спецыялістаў, а гэта найшырэйшы спектр».

Адзін з вядучых вектараў, якім заўсёды славілася Беларусь, — машынабудаванне. «Значыць, трэба рыхтаваць самых сучасных спецыялістаў па гэтым кірунку. Быў пэўны перыяд часу, калі інжынерным спецыяльнасцям удзялялася мала ўвагі. Цяпер трэба папаўняць колькасць інжынерных спецыялістаў для таго, каб прадпрыемствы па-ранейшаму працавалі ў сур'ёзным тэмпе, — канкрэтызаваў Аляксей Кубрын. — Акрамя таго, нельга забываць пра «бум», які працягваецца ў касмічнай тэматыцы. Ёсць задача кіраўніка дзяржавы аб фарміраванні падрыхтоўкі да выхаду на арбітальную групоўку спадарожнікаў дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі. Гэта таксама шырокі спектр спецыялістаў. Тыя прадпрыемствы, якія сёння ёсць, загружаныя досыць сур'ёзна, але людзей менавіта высокай кваліфікацыі ўсё роўна не хапае».



**Першы намеснік міністра адукацыі Беларусі Аляксандр БАХАНОВІЧ** адзначыў важнасць інжынернай адукацыі для падрыхтоўкі спецыялістаў, якія робяць важкі ўнёсак у развіццё эканомікі краіны: «Канцэпцыя развіцця інжынернай адукацыі, якая нядаўна прынята ўрадам на найбліжэйшыя 10 гадоў, праграма стварэння цэнтраў кампетэнцый і іншая работа, што сёння выконваецца ў Міністэрстве адукацыі разам з ВНУ, вядучымі прадпрыемствамі, заказчыкамі кадраў, безумоўна, дае свае вынікі. З будучымі спецыялістамі мы павінны гэтую работу пачынаць з ранняга ўзросту. Бачым, як эфектыўна запрацавалі нашы інжынерныя класы. З 2,5 тысячы выпускнікоў сёлета больш за 70 % паступілі ў ВНУ на інжынерна-тэхнічныя спецыяльнасці. Прыцягваем нашу моладзь да інжынерна-тэхнічнай адукацыі. У гэтым сэнсе форум ВНУ міжнароднага тэхналагічнага профілю — тая пляцоўка, дзе сустракаюцца спецыялісты і абмяркоўваюць цэлы шэраг пытанняў».

Аляксандр Бахановіч выказаў меркаванне, што спачатку трэба прыцягнуць маладога чалавека і ў інжынерна-тэхнічную адукацыю, і ў навуку, а затым аказаць яму ўсялякую дапамогу для таго, каб бізнес-інкубатары, стартап-праекты, праграмы настаўніцтва навукоўцаў і педагогаў дазволілі давесці сваю ідэю спачатку да нейкага зразумелага ўзору, а затым каб гэтая прадукцыя была пастаўлена на вытворчасці і працавала на эканоміку краіны.



Падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця **рэктар БНТУ Сяргей ХАРЫТОНЧЫК** нагадаў вынікі мінулых форумаў: «За 13 гадоў правядзення мерапрыемства мы дасягнулі вялікай колькасці вынікаў. Адзін з прыкладаў поспеху — стварэнне передавой інжынернай школы Саюзнай дзяржавы ў галіне гібрыднага станкабудавання. У гэтым кірунку мы стварылі новыя навучальныя праграмы, зрабілі акцэнт на лічбавізацыі, новых метадах падрыхтоўкі нашых студэнтаў. Мы таксама стварылі канструкцыю гібрыдна-апрацоўчага цэнтра. І сёння разам з расійскімі партнёрамі ўпэўнена рыхтуем спецыялістаў для гэтых кірункаў».

Паводле яго слоў, мы самі сталі рыхтаваць спецыялістаў у галіне атамнай энергетыкі для Беларускай атамнай электрастанцыі. «На першых этапах Ніжагародскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт узяў асноўныя моманты падрыхтоўкі нашых студэнтаў на сябе. Паступова мы пераймалі іх вопыт і сёння ўжо самастойна вядзём падрыхтоўку сваіх студэнтаў для гэтай галіны. Таксама з пачатку правядзення форуму вельмі актыўна заняліся падрыхтоўкай спецыялістаў для патрэб абароннага комплексу. Такога кірунку не было ў нашым універсітэце, і наш партнёр — Іжэўскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт — спрыяў стварэнню гэтага кірунку навучання ў нас», — паведаміў рэктар БНТУ.

Асноўная канцэпцыя форуму прысвечана папулярызацыі інжынернай адукацыі, прыцягненню моладзі ў сферу навукі, стварэнню міжуніверсітэцкай платформы для рэалізацыі ключавых кірункаў беларуска-расійскага інтэграцыйнага супрацоўніцтва па прыярытэтных вектарах развіцця навукі і тэхнікі і падтрымцы таленавітай моладзі.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота БНТУ.**




**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Республиканскому дочернему унитарному предприятию по обеспечению нефтепродуктами**

**«Белоруснефть-Гроднооблнефтепродукт»**

**Аукцион состоится 14.11.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 8 (0152) 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | **Лот № 1<br>Зерноуборочный комбайн КЗС-1218-11 «Палессе GS 12», гос. № СВ-4 7798 (инв. № 589).<br>Лот № 3<br>Агрегат почвообрабатывающий посевной АПП-6Г (инв. № 515)** |
| **Условия аукциона** | 1. 100 % предоплата при покупке лота.<br>2. Возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта.<br>Обременений со стороны третьих лиц нет |
| **Начальная цена продажи** | Лот № 1: 32 084,75 руб. (тридцать две тысячи восемьдесят четыре рубля семьдесят пять копеек) с учетом НДС.<br>Лот № 3: 14 996,95 руб. (четырнадцать тысяч девятьсот девяносто шесть рублей девяносто пять копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | Лот № 1: 3 208 руб. (три тысячи двести восемь рублей).<br>Лот № 3: 1 499 руб. (одна тысяча четыреста девяносто девять рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).<br>Обед с 12.30 до 13.18.<br>Последний день приема заявлений – **12.11.2025 г. до 15.00** |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «МОГОТЕКС», г. Могилев, ул. Гришина, 87. УНП 700116054 |
| **Оператор / Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |
| **Предмет электронного аукциона** | |
| **Изолированное помещение: 10946,1 кв. м** (производственное помещение, инв. № 700/D-147704), по адресу: **Могилевская обл., г. Могилев, ул. Гришина, 89Г-2.**<br>В состав лота входит **ТП-6/10/0,4 кВ** (инв. № 420394), **две кабельные линии ААБ-10 (3*240, 10** кВ). ***Обременение:*** помещение находится в залоге у банка | |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 6 001 100.00 бел. руб.**<br>Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона | |
| **Задаток 1 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать) календарных дней** со дня завершения электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение 1 % от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 25.11.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 24.11.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, E-mail: auction@cpo.by** | |

29.10.2025 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».

Повестка дня

1. О внесении изменений в решение общего собрания акционеров.

Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 23.10.2025 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Дата сбора реестра акционеров – 23.10.2025 г.

Наблюдательный совет.

УНП 400022625

# МАСТАЦТВА РЫЗЫКАВАЦЬ І ПЕРАМАГАЦЬ

## Стартапы з'яўляюцца адным з фактараў узнаўлення тэхналагічнага бізнесу



Велізарны патэнцыял Беларусі — у творчай моладзі. І ён да канца не выкарыстаны. Паколькі ў рэйтынгах па ўзроўні развіцця чалавечага капіталу мы займаем нашмат больш высокія пазіцыі, чым па эканамічных паказчыках. І па колькасці стартапаў мы яшчэ не выйшлі да здавальняльнай планкі. Стартапы, а кажучы айчыннай тэрміналогіяй, малыя інавацыйныя кампаніі, з'яўляюцца глебай для ўзнаўлення і развіцця бізнесу. Несумненна, не ўсе ідэі спрацоўваюць, не ўсе праекты знаходзяць свайго спажыўца і дасягаюць камерцыйнага поспеху. Але шлях адолее той, хто ідзе. Тым больш што цікавасць да прадпрымальніцтва ў нашай моладзі вельмі высокая. Але неабходна яе падмацаваць інфраструктурай і фінансавым складнікам. Пра гэта гаварылі на вытворча-практычнай канферэнцыі «Стартап-рух — шанц і сацыяльны ліфт для моладзі Беларусі».

### ДАРОГУ МОЛАДЗІ!

**Кіраўнік стартап-цэнтра Парка высокіх тэхналогій Дзмітрый МІКУЛКА** спаслаўся на даныя апытання каля 2 тысяч студэнтаў, якое паказала: 45 % плануюць займацца прадпрымальніцтвам, а 10 % ужо з'яўляюцца ўласнікам бізнесу. Ініцыятыва знізу вельмі магутная. Але шлях ад цікавай ідэі да яе ўкаранення і атрымання станоўчага фінансава-эканамічнага выніку цярністы. І распаўсюджанае меркаванне, што геній заўсёды праб'е сабе дарогу ў дадзеным выпадку, некалькі не працуе. Каб працэс быў лавінападобным, масавым і незваротным, неабходна адпаведная інфраструктура.

Па вялікім рахунку, яна ў Беларусі ёсць. Парк высокіх тэхналогій, кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень» прапаноўваюць сваім рэзідэнтам прывабныя фіскальныя ўмовы і вельмі годную інфраструктуру. Але да ўзроўню рэзідэнта яшчэ неабходна дарасці. Як адзначыў Дзмітрый Мікулка, для актывізацыі інавацыйнага складніка малога бізнесу неабходна выбудаваць экасістэму, якая б фарміравала маршрут праекта ад ідэі, яе ацэнкі і экспертызы, распрацоўкі пілотных прадуктаў да стварэння юрыдычнай асобы і выхаду на рынак.

Такі маршрут паступова вымалёўваецца. Дзмітрый Мікулка перакананы, што кузняй стартапаў павінны стаць беларускія ўніверсітэты. Там ёсць і пэўная матэрыяльная тэхнічная база — тыя ж лабараторыі, якія дазваляюць адпрацаваць інжынерныя ідэі, ва ўніверсітэтах канцэнтруецца найбольш пасіянарная моладзь, там жа маецца кваліфікаваны выкладчыцкі і навуковы корпус, здольны фарміраваць экспертызу. Як адзначыў спікер, ПВТ заключыла адпаведнае пагадненне з Міністэрствам адукацыі. Сфарміраваны дарожныя карты супрацоўніцтва з шэрагам беларускіх ВНУ. Дзмітрый Мікулка перакананы: беларускаму інавацыйнаму сектару неабходна вырывацца з аўтсорсінгу і пераходзіць да прадуктовых мадэляў. А для гэтага неабходныя інжынерныя ідэі, экспертыза прадпрымальнікаў, як ноу-хау загарнуць і прадаць, і, натуральна, патрабуецца фінансаванне. А таксама пляцоўкі (экасістэма), на якіх злучаюць усе тры кампаненты.

### ГРАНТАВАЯ СІСТЭМА РАЗБЭШЧВАЕ

Мабыць, самае актуальнае сёння пытанне інвестыцыйнае. **Намеснік дырэктара па развіцці бізнес-саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя Куняўскага Дзмітрый КРУПСКІ** распавёў пра апытанне прадстаўнікоў бізнесу. Аказалася, што каля паловы рэспандэнтаў выступаюць за больш гнуткую і глыбокую падтрымку інавацыйнага бізнесу на пачатковым этапе. І практычна ўсе адзначылі адсутнасць венчурнага фінансавання і складанасць у прыцягненні фінансаў. Эксперт лічыць, што развіццё экасістэмы стартапаў у тым ці іншым выглядзе лагічна і мэтазгодна прапісаць у адной з дзяржпраграм. Тады ў кіраўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання з'явіцца стымул прыкладаць больш намаганняў для развіцця малога інавацыйнага бізнесу.

Дзмітрый Мікулка са свайго боку адзначыў: ёсць пул прадпрымальнікаў — уладальнікаў уласнага моцнага бізнесу, якія зацікаўлены інвеставаць і працаваць са стартапамі. Нават на самых ранніх стадыях. Аднак у Беларусі яшчэ не склалася выразная практыка і механізмы такіх укладанняў. Ёсць асобныя ўдалыя і не вельмі кейсы. Але з'ява пакуль не вельмі распаўсюджаная. Ён адзначыў, што для гэтага ў рамках ПВТ стварылі венчурную акадэмію, у рамках якой будуць акумуляваць вопыт і развіваць кампетэнцыі. Адначасова Дзмітрый Мікулка выказаў сумнеў, што дзяржаве мэтазгодна выдзяляць сродкі на фінансаванне стартапаў напрамую. Грантавая сістэма пры занадта шырокім яе выкарыстанні прыносіць, на яго думку, неадназначную карысць. Сродкі, атрыманыя праз адміністрацыйныя інструменты, зніжаюць інавацыйную актыўнасць і разбэшчваюць: стартапы ёсць, але нярэдка яны неканкурэнтаздольныя і валодаюць практычна нулявой выжывальнасцю пры адключэнні ад фінансавага падсілкоўвання. І такі не самы ўдалы вопыт прысутнічае ў краінах СНД. Па перакананні Дзмітрыя Мікулкі, дзяржава павінна стварыць умовы для развіцця інавацыйнага руху. А развівацца ён павінен ужо на рынкавых прынцыпах.





### ІНАВАЦЫЙНАЕ ФІНАНСАВАННЕ — НЕ ГУЛЬНЯ Ў РУЛЕТКУ

**Дырэктар навукова-тэхналагічнага парка ТАА «Інката» Яўген МАЛЬЧЭЎСКІ** канстатаваў: часам нават пры наяўнасці грошай не заўсёды зразумела, як іх вылучыць на інавацыйныя праекты. У прыватнасці, тэхнапаркі фарміруюць інавацыйныя фонды. Іх яны могуць выкарыстоўваць на вылучэнне грантаў, пазыкі, аплату тых ці іншых паслуг суб'екта гаспадарання. Пакуль тэхнапаркі ў боль-шасці сваёй назапашваюць сродкі. Бо, па сутнасці, з'яўляючыся мікрабізнесам — у штаце адміністрацыі тэхнапаркаў звычайна працуе ўсяго некалькі чалавек, — няма кампетэнцый, каб правільна фармалізаваць інвеставанне інавацыйных фондаў. Узнікае шэраг пытанняў: па якім прынцыпе адбіраць праекты? якія павінны прапісвацца ўмовы? як афармляцца юрыдычна?.. Цэлы комплекс невядомых, якія пакуль не атрымалі канчатковага рашэння.

На мой погляд, ёсць у цэлым сістэмнае і філасофскае пытанне: які ўзровень рызыкі дапушчальны (фармальна ці нефармальна) у венчурных інвестыцыях? У кожнай краіне выпрацаваліся свае падыходы да інавацыйнай рызыкі і яе абгрунтаванасці. Інавацыйнае фінансаванне — не гульня ў рулетку, а цалкам прадуманы працэс. Рызыкі ёсць, але яны, часцей за ўсё, пралічваюцца і кіруюцца. І ацэньваюцца зыходзячы з пэўных методык. Іх, наколькі разумею, у Беларусі яшчэ трэба будзе выпрацаваць. Каб не ўзнікала лішніх падазрэнняў. У той жа падатковай інспекцыі і іншых кантрольных органаў. Бо адпрацоўка інжынернай ідэі на ацэнку яе жыццяздольнасці на самай ранняй стадыі рэалізацыі можа запатрабаваць да 100 тысяч долараў укладанняў. Выдаткавалі сродкі на эксперыменты і выпрабаванні і зразумелі: памыліліся. Тупікі ў інавацыях — нармальная з'ява. І адсутнасць выніку павінна ўсім быць зразумелай і прымальнай. Каб не ўзнікала падазрэнняў, напрыклад, ва ўхіленні такім чынам ад падаткаў. Несумненна, у гэтым працэсе вельмі важны давер усіх бакоў. І ён паступова фарміруецца. У тым ліку і ў рамках дыскусійных пляцовак.

**Аляксей КЛІМАЎ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**







# АКТУАЛІІ АНЛАЙН-ГАНДЛЮ

## Лічбавы беларускі рубель плануецца задзейнічаць ужо налета

Першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Аляксандр ЯГОРАЎ расказаў пра перавагі і рызыкі анлайн-гандлю для айчынных вытворцаў падчас канферэнцыі «E-Com Day. 2025».



Не сакрэт, што анлайн-гандаль істотна ўплывае на эканамічнае развіццё краіны. «Першы фактар, які спрыяе росту айчыннай эканомікі, — гэта зніжэнне транзакцыйных выдаткаў. Раней, каб атрымаць спажыўцу тавар, трэба было выдаткаваць вялікую колькасць часу. Цяпер час праходжання ад вытворцы да кліента істотна зніжаецца. Гэта прыводзіць да росту таваразвароту і росту ВУП. Другі важны фактар — выключэнне асіметрычнасці інфармацыі. Раней кліент мог прыходзіць у краму побач з домам, і толькі там ён мог набыць тавар. Цяпер у спажыўца шырокі выбар тавараў ад розных вытворцаў, калі пакупнік самастойна вызначае мінімальную цану тавару непасрэдна для сябе. Гэта вельмі важна для спажыўца і эканомікі краіны ў цэлым, — адзначыў першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка.

Ён звярнуў увагу, што разам з тым існуюць рызыкі, да якіх прыводзіць анлайн-гандаль.

— Узнікае рызыка, што па гэтых каналах гандлю ў краіну пранікае досыць вялікі паток імпартных тавараў, што можа негатыўна ўплываць на гандлёвы абарот унутры краіны. Тут на ўзроўні ўрада трэба прымаць комплекс мер, якія б мінімізіравалі гэтыя негатыўныя наступствы.

Аляксандр Ягораў патлумачыў, што ў першую чаргу гэта напаўненне з боку вытворцаў анлайн-платформ беларускімі таварамі.

— Неабходна распрацаваць спецыяльныя таварныя лініі, якія былі б падмацаваныя пэўнымі фінансавымі інструментамі на тавары айчыннай вытворчасці для таго, каб іх было выгадна купляць, — выказаў меркаванне ён. — Акрамя таго, анлайн-гандаль спрыяе спрашчэнню ланцужкоў паставак — ад беларускіх вытворцаў наўпрост да спажыўца. Цяпер мы назіраем, што ёсць па-ранейшаму вытворцы, якія не напрамую прадаюць свой тавар, а праз пасрэднікаў. І анлайн-платформы як бы дазваляюць гэтых пасрэднікаў прыбраць. Самае важнае, задача нашых прадпрыемстваў — выкарыстоўваць гэтыя транснацыянальныя анлайн-платформы для прасоўвання нашай прадукцыі і для максімізацыі даходнасці экспарту.

Што датычыцца будучага анлайн-гандлю ў Беларусі, паводле ацэнак Нацбанка, ён будзе адыгрываць лідзіруючую ролю.

— Задача нашых вытворцаў — гэта ўлічваць, што калі раней у кліента быў абмежаваны выбар і ён купляў тавары ў двух-трох крамах паблізу, то цяпер у спажыўца існуе максімальна шырокі выбар. І вытворцу трэба змагацца за спажыўца і забяспечыць яго найбольш якасным, найлепшым таварам. А задача астатніх інстытутаў, напрыклад банкаўскай сістэмы, — даць інструменты (крэдытныя лініі на спецыяльных умовах і іншыя фінансавыя прадукты), якія б спрыялі падтрымцы менавіта беларускіх тавараў пры продажах — як на экспарт, так і ўнутры краіны.

Адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды», прадстаўнік Нацбанка адзначыў, што Беларусь — экспартна арыентаваная краіна, таму мы павінны прапанаваць канкурэнтаздольны тавар для выхаду на знешнія рынкі.

— Задача, якая была пастаўлена перад намі кіраўніком дзяржавы, — выходзіць на знешнія рынкі і перамагаць там у адкрытай канкурэнтнай барацьбе. З моцнымі пазіцыямі на знешніх рынках мы будзем упэўненыя ў тым, што не аддадзім каму-небудзь свой унутраны рынак, — падкрэсліў Аляксандр Ягораў.

Асобна ён выказаўся аб дзейнасці замежных маркетплэйсаў на рынку Беларусі.

— На мой погляд, задача ў тым, каб тыя платформы, што прыходзяць на беларускі рынак, працавалі па нашых правілах, якія існуюць у Беларусі, каб гэтыя структуры функцыянавалі праз беларускіх рэзідэнтаў. У гэтым выпадку яны будуць выплачваць тут падаткі, плаціць заработную плату людзям і будаваць лагістычныя цэнтры. А гэта, па сутнасці, з'яўляецца прамымі інвестыцыямі ў нашу эканоміку. Акрамя таго, праца электронных платформ павінна быць накіравана ў абодва бакі, гэта значыць, не толькі сюды павінен прыходзіць імпартны тавар, але і адсюль ісці тавар на экспарт. Калі гэта ўсё выконваецца, то істотнай рызыкі ад гэтых платформ для нас не будзе. Гэта такія ж драйверы росту для нас, як і іншыя пляцоўкі, — выказаў упэўненасць першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка.

Паводле яго слоў, тэма анлайн-гандлю будзе вызначаць развіццё і сусветнай эканомікі, і эканомікі Беларусі ў найбліжэйшыя пяць—дзесяць гадоў.

— Гэта датычыцца таго, што дзеянні чалавека пераводзяцца ў лічбавыя каналы, — адзначыў ён.

Па словах Аляксандра Ягорава, анлайн-гандаль ідзе рука аб руку з анлайн-плацяжамі. Так, калі раней пры звычайным гандлі выкарыстоўваўся, умоўна, аднаканальны спосаб аплаты, то-бок або наяўным, або карткай, то цяпер, на яго думку, трэба пераходзіць да мультыканальнага ўзаемадзеяння ў гэтым плане.

— У прынцыпе для гэтых і іншых мэт мы плануем з 2026 года (але актыўна — з 2027 года) задзейнічаць такі інструмент, як лічбавы беларускі рубель. Ён дазволіць, па-першае, адсочваць плацяжы, па-другое, гарантаваць, што калі чалавек купляе тавар, то плацеж будзе праходзіць тады, калі гэты тавар будзе дастаўлены, — патлумачыў першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка.

**Сяргей КУРКАЧ.**





> **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА:**
>
> *— Задача пяцігодкі — зрабіць турызм нацыянальным праектам. Адкрыць свету нашы гісторыю, культуру і мову. Гэта індустрыя па значнасці і эканамічным патэнцыяле не саступае, напрыклад, машынабудаванню.*
>
> **Падчас цырымоніі ўступлення на пасаду зноў абранага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, 25 сакавіка 2025 г.**

# ЦІКАВАСЦЬ ДА БЕЛАРУСІ РАСЦЕ

## Экспарт турыстычных паслуг за 8 месяцаў года склаў 255 мільёнаў долараў

Шмат гэта ці мала? Калі браць статыстыку, то мы прырастаем — тэмп росту больш за 140 % да леташняга ўзроўню. Пагаварылі з намеснікам міністра спорту і турызму Алегам АНДРЭЙЧЫКАМ пра тэндэнцыі ў турыстычнай галіне, і ці зможам мы ў перспектыве пайсці па шляху Арабскіх Эміратаў, дзе турыстычная сфера стала адной з ключавых у папаўненні даходу краіны.



### ПАБІЛІ РЭКОРД УДАЛАГА ГОДА

Як распавёў суразмоўца, летась экспарт турыстычных паслуг у Рэспубліку Беларусь склаў 268,1 мільёна долараў ЗША.

— Гэта быў рэкордны год, ён перасягнуў узровень дакавіднага 2019-га. У цэлым 2019 год для нашай краіны быў вельмі паспяховы, таму што адбылося шмат значных падзей (II Еўрапейскія гульні і шэраг іншых буйных мерапрыемстваў).

А што цяпер?

— Паводле папярэдніх вынікаў 8 месяцаў 2025-га, мы маем 255 мільёнаў долараў ЗША з тэмпам росту 141,9 % да аналагічнага ўзроўню мінулага года, — канстатаваў намеснік міністра.

Чаму ўжо можна падводзіць папярэднія вынікі і ацэньваць выніковасць цяперашняга турыстычнага сезона? На думку эксперта, гэтаму спрыяюць даныя за летні сезон, які з'яўляецца асноўным у нашай краіне (з улікам сезоннасці).

— Мы даволі нядрэнна адпрацавалі гэты перыяд, — падкрэслівае ён.

Хто да нас едзе? Дынаміка назіраецца па ўсіх краінах, традыцыйна гэта краіны СНД, але пачалі больш актыўна цікавіцца магчымасцямі адпачынку ў Беларусі і больш далёкія ад нас дзяржавы.

— Вельмі добра пайшлі кантакты з краінамі «далёкай дугі», — прыводзіць прыклад суразмоўца. — Напэўна, за апошнія гадоў 5-6 дакладна ў нас не было такога ўсплёску — рост 159 % за гэты перыяд.

### ЯКІЯ КРАІНЫ Ў ТОПЕ?

— Тут і Кітай, і Індыя, і Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, і іншыя краіны ўмацавалі свае пазіцыі ў экспартным плане. Гэтаму спрыяла, безумоўна, мноства прычын, але самае галоўнае, на мой погляд, — усталяванне авіяцыйнай лагістыкі. У нас стала больш авіярэйсаў з тым жа Кітаем — ужо цяпер выконваюцца палёты ў чатырох напрамках, нядаўна дадаўся рэйс на востраў Хайнань (горад Санья). Адкрыўся рэйс у В'етнам. Зразумела, што гэта ўплывае на выязны турызм, тым не менш паралельна патокі ўязнога турызму будуць павялічвацца. Таму гэта таксама вельмі важна, — падкрэсліў суразмоўца і патлумачыў. — У нас была такая практыка, калі праз выязны турызм мы павялічвалі кантакты, завязвалі сувязі (у першую чаргу нашы тураператары, турбізнесы актыўна працавалі з партнёрамі з гэтых краін) і адпаведна павялічваліся патокі.

### ЯК ІДЗЕ ПАДЛІК ТУРЫСТАЎ?

Цікавая дэталь — статыстычны ўлік. Мяжа з Расіяй у нас адкрытая, грамадзяне гэтай краіны могуць (і робяць гэта рэгулярна) бесперашкодна прыязджаць у Беларусь на адпачынак, які арганізавалі сабе самастойна, ці адлюстроўваюцца гэтыя лічбы ў статыстычным уліку?

— Нацыянальны статыстычны камітэт улічвае некалькі паказчыкаў. Прасцей вылічыць арганізаваных турыстаў, таму што гэта фіксаваная справаздачнасць арганізацый, якія прадастаўляюць турыстычныя паслугі. Але спецыфіка нашай краіны такая, што большая частка турпатоку ідзе праз беларуска-расійскую мяжу і тут існуюць розныя методыкі, — растлумачыў Алег Андрэйчык. — Па даных Белстата, па выніках мінулага года здзейснена 6 мільёнаў 600 тысяч паездак замежных турыстаў у Рэспубліку Беларусь. Сюды ўключаліся і арганізаваныя турпатокі, і турысты, якія пражывалі ў нас у сродках размяшчэння (гасцініцы, санаторыі, хостэлы), тут лічылі справаздачнасць арганізацый, якія прадастаўлялі экскурсійныя паслугі, паслугі харчавання і іншыя. Таму такі зборны механізм фарміруе гэту лічбу.

Плюс, па словах эксперта, існуе методыка, звязаная з дапаможным улікам турыстаў (дапаможны лік турызму Рэспублікі Беларусь), калі вядуцца маніторынгі.

— Ідзе выбарка патокаў на дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь і анкетаванне ў сродках размяшчэння. Гэта методыка выкарыстоўваецца Сусветнай турыстычнай арганізацыяй, і такі ж падлік вядзецца ў іншых краінах свету, таму нам прасцей параўноўваць. Па выніках 2024-га ў нас зафіксавана 6 мільёнаў 600 тысяч паездак замежных турыстаў — гэта на мільён больш, чым у 2023 годзе. А значыць, за год мы прыраслі на мільён турыстаў, і такая дынаміка захоўваецца. Думаем, што сёлетні прырост складзе як мінімум паўтара мільёна чалавек.

Трэба разумець, што сёння турызм больш сыходзіць у вектар самастойных падарожжаў, і турысты, якія заязджаюць у Беларусь, лёгка карыстаюцца асабістым аўтатранспартам або, скажам, рэгулярнымі чыгуначнымі, аўтобуснымі, авіяцыйнымі рэйсамі, агрэгатарам браніравання жылля. З гэтым праблем няма.

— Мы бачым, што з году ў год працэнт суадносін арганізаваных турыстаў да агульнага аб'ёму турыстаў за кошт павелічэння аб'ёму індывідуальных турыстаў памяншаецца, — звярнуў увагу намеснік міністра. — Я казаў пра 6 мільёнаў 600 тысяч, а аб'ём арганізаваных турыстаў, якія да нас прыехалі, удзельнічалі ў паўнавартасных турах, — каля 350 тысяч. Гэта зусім іншая лічба. Але ж мы бачым статыстыку па гасцініцах, і яна таксама значна павялічылася (у нас мільёны размяшчэнняў па санаторна-курортных установах і гэтак далей). Таму такая асаблівасць сучаснага турызму ўласцівая ўсім краінам, асабліва з добрымі транспартнымі зносінамі, як у нас.

### ПЛАНЫ НА ЗАЎТРА

Варта сказаць, што планы па экспарце турыстычных паслуг на перспектыву — амбіцыйныя.

— Ёсць праграма дзейнасці ўрада да 2029 года, праект Дзяржаўнай праграмы «Беларусь гасцінная» на 2026—2030 гады, прапановы ў Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця на 5 гадоў, дзе мы плануем, што рост экспарту турыстычных паслуг да 2030-га павінен павялічыцца на 180 % ад узроўню 2025 года. Гэта значыць, як мінімум паўмільярда долараў мы будзем атрымліваць ад экспарту, — падзяліўся планамі Алег Андрэйчык.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**








Фота БелТА.

### Толькі лічбы

По выніках **2024-га** ў Беларусь было здзейснена **6 мільёнаў 600 тысяч паездак замежных турыстаў** — гэта **на мільён больш, чым у 2023 годзе.**

Па выніках **8 месяцаў 2025-га** экспарт турыстычных паслуг склаў **255 мільёнаў долараў.**

**Тэмп росту — 141,9 %** да аналагічнага ўзроўню мінулага года.

**Рост краін «далёкай дугі»** за гэты перыяд — **159 %.**

Тэмп росту экспарту турыстычных паслуг **да 2030 года павінен скласці 180 %** ад узроўню 2025-га і **дасягнуць** сумы ў **0,5 мільярда долараў.**





**У тэму**

# ПЯЦІГОДКА — У ПЛЮС

## Попыт на медыцынскія паслугі для замежнікаў вырас у 1,5 раза



Фота БелТА.

Экспарт медыцынскіх паслуг у Беларусі апошнія 5 гадоў дэманструе ўстойлівую дынаміку. За гэты час ён вырас у 1,5 раза, дасягнуўшы сёлета 50 мільёнаў долараў ЗША. Чакаецца, што колькасць замежных грамадзян, якія пралячыліся ў беларускіх клініках, вырасце сёлета да 163 тысяч чалавек. Сярэдні чэк на аднаго пацыента павялічыцца на 20 % — з 260 долараў у эквіваленце ў 2020 годзе да 310 долараў у 2025-м.

Такі прырост адбыўся за кошт павелічэння аб'ёмаў экспарту медыцынскіх паслуг па найбольш запатрабаваных кірунках галіны аховы здароўя — анкалогіі, транспланталогіі, траўматалогіі, неўралогіі і нейрахірургіі, кардыялогіі, акушэрстве і гінекалогіі, афтальмалогіі, стаматалогіі, а таксама рэабілітацыйнай медыцыне. Усё часцей замежныя пацыенты цікавяцца малаінвазіўнымі ўмяшаннямі, метадамі ранняй дыягностыкі і індывідуальнымі рэабілітацыйнымі праграмамі.

Як паведаміла **прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН**, толькі летась больш за 160 тысяч замежных пацыентаў са 159 краін атрымалі медыцынскую дапамогу ў беларускіх установах аховы здароўя. Адзначаецца рост аб'ёмаў экспарту медыцынскіх паслуг у краіны памежжа. Гэта сведчыць аб высокім даверы да нацыянальнай сістэмы аховы здароўя з боку замежных грамадзян. Вядучыя клінікі, такія як рэспубліканскія навукова-практычныя цэнтры, клінічныя і гарадскія бальніцы, актыўна ўдзельнічаюць у аказанні паслуг замежнікам.

Значная колькасць пацыентаў прыязджае ў Беларусь з краін СНД — Расіі, Казахстана, Узбекістана, Арменіі, а таксама з Германіі, Ізраіля, Польшчы, Латвіі, Літвы, Кітая і іншых дзяржаў. Узрост пацыентаў — у асноўным ад 35 да 65 гадоў, часта яны маюць хранічныя ці складаныя захворванні, якія патрабуюць высокатэхналагічнага ўмяшання або працяглага аднаўленчага курса.

Беларуская сістэма аховы здароўя мае шэраг канкурэнтных пераваг, якія даюць магчымасць паспяхова развіваць экспарт медыцынскіх паслуг. Па-першае, гэта высокі ўзровень кваліфікацыі медыцынскіх работнікаў, многія з якіх прайшлі навучанне і стажыроўкі ў вядучых замежных клініках. Па-другое, краіна мае сучасную матэрыяльна-тэхнічную базу, у тым ліку абсталяванне для правядзення складаных аперацый, даследаванняў і дыягностыкі. Па-трэцяе, кошт медыцынскіх паслуг у Беларусі ў разы ніжэйшы ў параўнанні з аналагічнымі прапановамі ў краінах Еўрасаюза пры захаванні высокага ўзроўню якасці. Акрамя таго, важнай перавагай з'яўляецца адсутнасць моўнага бар'ера для рускамоўных пацыентаў і наяўнасць бязвізавага ўезду або спрошчанага візавага рэжыму для шэрагу краін.

Спалучэнне навуковых распрацовак, адукацыйнай дзейнасці і фармацэўтычнай прамысловасці, укаранёных у медыцынскую практыку, сталі рухавікамі ўязнога медыцынскага турызму. Ва ўмовах глабалізацыі і росту мабільнасці насельніцтва экспарт медыцынскіх паслуг становіцца важным кірункам развіцця нацыянальных сістэм аховы здароўя. Беларусь, валодаючы развітой медыцынскай інфраструктурай і высокакваліфікаванымі кадрамі, актыўна фарміруе ўстойлівы рынак медыцынскага турызму, прапануючы замежным пацыентам доступ да якаснай і высокатэхналагічнай дапамогі. Экспарт медыцынскіх паслуг садзейнічае ўмацаванню іміджу краіны, стварэнню дадатковых крыніц фінансавання сістэмы аховы здароўя і развіццю рэгіёнаў.

У перспектыве Беларусь плануе штогод павялічваць аб'ём экспарту медыцынскіх паслуг на 5—10 %. Сярод ключавых кірункаў — развіццё тэлемедыцыны, навучанне замежнікаў у медыцынскіх ВНУ краіны, пашырэнне супрацоўніцтва з замежнымі страхавымі кампаніямі і дабрачыннымі фондамі, павышэнне пазнавальнасці брэнда беларускай медыцыны. Стратэгія развіцця экспарту медыцынскіх паслуг на 2025—2035 гады прадугледжвае мадэрнізацыю медустаноў, падрыхтоўку персаналу, маркетынгавае прасоўванне паслуг за мяжой, удзел у міжнародных выстаўках, паляпшэнне сэрвісу ў бальніцах.

**Алена КРАВЕЦ.**



Фота БелТА.



PRO ЭКАНОМІКУ

# КУРС НА АБНАЎЛЕННЕ

## КАМФОРТНЫ І ЭКАЛАГІЧНЫ

Толькі сёлета на рамонт і рэканструкцыю дарог у краіне затрачана 2,3 мільярда рублёў. У найбліжэйшыя паўтара гады даручэнне кіраўніка дзяржавы — злучыць усе аграгарадкі з раённымі цэнтрамі дарогамі з удасканаленым пакрыццём — будзе выканана. Абнаўляецца і пасажырскі транспарт: на дарогах сучасныя, бяспечныя і экалагічныя аўтобусы, электробусы, тралейбусы выцясняюць папярэднікаў. Сучасны транспарт ва ўсіх сэнсах становіцца бліжэйшым да пасажыра: з'яўляюцца сучасныя мабільныя дадаткі па хуткай аплаце праезду і лічбавыя платформы, у прыватнасці адзіная сістэма браніравання і продажу білетаў, якая аб'яднае ўсіх перавозчыкаў рэспублікі.

Сёлета парк рухомага саставу транспарту агульнага карыстання будзе абноўлены на 11 %. На сённяшні ўжо набыта каля 460 аўтобусаў, 114 тралейбусаў, 29 электробусаў, 19 трамвайных вагонаў. Як адзначае **начальнік упраўлення аўтамабільнага і гарадскога пасажырскага транспарту Міністэрства транспарту і камунікацый Андрэй ГЛАДКІ,** значная ўвага цяпер надаецца развіццю электрыфікаванага транспарту. Напрыклад, у Наваполацку рэалізоўваецца пілотны праект, дзе эксплуатуецца ўжо 26 электробусаў беларускай вытворчасці. Вялікія планы па абнаўленні і ў сталіцы. Перавага аддаецца таксама электрыфікаванаму рухомаму саставу — як электробусам, так і тралейбусам на аўтаномным ходу, якія могуць рухацца без кантактнай сеткі.

Што датычыцца тралейбусаў, то каля 160-170 новых адзінак закуплена сёлета. Такія меры павышаюць камфорт пасажыраў, якасць транспартных паслуг. Дарэчы, пасажыраабарот з года ў год павялічваецца.

## ЗАБРАНІРАВАЦЬ І АПЛАЦІЦЬ — ПРАЗ МАБІЛЬНЫ ДАДАТАК

Плануецца стварыць у краіне і адзіную сістэму аплаты праезду, якая будзе дзейнічаць як у Мінску, так і ў рэгіёнах. Яна зробіць зручнейшым працэс аплаты праезду, а таксама аб'яднае розныя плацежныя метады ў рамках адной платформы. Адзіная сістэма аплаты праезду будзе створана на базе працэсінгавага цэнтра «Мінсктранса». Будзе забяспечана функцыяніраванне адзінага эмісійнага цэнтра па выпуску білетаў на гарадскія перавозкі пасажыраў. Ужо адобраны тэхнічны пашпарт мерапрыемства, а закупка адпаведнага абсталявання аблыканкамамі запланавана на пачатак 2026 года.

Сістэма будзе ўкаранёна ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі. Таксама сумесна з прадпрыемствам «Сталічны транспарт і сувязь» распрацоўваецца адзіная сістэма продажу білетаў на аўтамабільныя перавозкі пасажыраў у рэгулярных зносінах. Праект прадугледжвае аб'яднанне сістэм браніравання і продажу білетаў у адзіную лічбавую платформу, даступную пасажырам у тым ліку з мабільных дадаткаў, інтэграцыю электронных сэрвісаў пры міжнародных аўтамабільных перавозках пасажыраў у рэгулярных зносінах у геаінфармацыйную сістэму і інш.

Прадугледжваецца, што адзіная дзяржаўная інфармацыйная сістэма продажу білетаў пачне працаваць з 1 мая 2027 года. У выніку пасажыры змогуць атрымліваць актуальную інфармацыю аб раскладзе, маршрутах і даступнасці транспартных сродкаў усіх аўтамабільных перавозчыкаў у рэгулярных







зносінах, выбіраць аптымальны маршрут паездкі (з прапанаваных маршрутаў), адсочваць рух аўтобусаў, браніраваць месцы і аддалена набываць праязныя дакументы і ажыццяўляць аплату за праезд (правоз багажу). Гэта выключыць затраты перавозчыка на распрацоўку ўласнага праграмнага сродку па браніраванні месцаў. Яшчэ адна перавага — аператыўнае паступленне грашовых сродкаў ад прададзеных білетаў.

## ГАЛАСАВЫ ПАМОЧНІК НА ПРЫПЫНКУ

У Мінску перавозка пасажыраў грамадскім транспартам арганізавана па 322 маршрутах. Штодзень на вуліцы сталіцы выязджае каля паўтары тысячы аўтобусаў, тралейбусаў, электробусаў, трамваяў. Таксама курсіруюць маршруткі. Маршрутная сетка пастаянна ўдасканальваецца. За апошнія пяць гадоў адкрыты 41 маршрут, закрыты — 21. Акцэнт робіцца на развіцці сістэмы транспартна-перасадачных вузлоў, каб пасажырам было зручна пераходзіць з аднаго віду транспарту на другі.

Удасканальваюцца і тэхналогіі. Напрыклад, дзейнічае бясплатная галасавая паслуга аб прыбыцці транспарту. Каб ёю скарыстацца, трэба патэлефанаваць па кароткім нумары 488 і паведаміць аўтаадказчыку код прыпынку. Яго можна знайсці на таблічцы з раскладам каля QR-кода. Галасавы памочнік паведаміць час прыбыцця найбліжэйшых аўтобусаў, тралейбусаў і трамваяў.

Пашыраюцца спосабы і формы аплаты праезду. У прыватнасці, у першым паўгоддзі ў метрапалітэне ўкаранёна сістэма «Аплаці» з магчымасцю рэалізацыі праязных дакументаў.

— На першым тралейбусным маршруце тэсціруецца сістэма аплаты праезду банкаўскай карткай, а ў наступным месяцы пастараемся максімальна паскорыць працэс, запусціць яе на першым аўтобусным маршруце. Дапрацоўваем чат-бот для зваротнай сувязі з пасажырамі, для атрымання адзнакі, прапаноў, адпрацоўкі недахопаў, — расказвае **дырэктар ДП «Сталічны транспарт і сувязь» Юрый СУПРАНОВІЧ.**

Пілотны праект будзе маштабіраваны. У 2026 годзе значна павялічыцца колькасць рухомага саставу, дзе можна будзе расплаціцца такім спосабам. Яшчэ адзін кірунак развіцця — электрыфікацыя рухомага саставу. Прадугледжана абнаўленне аўтапарка.

Кожны дзень ў будні паслугамі грамадскага транспарту карыстаецца каля 1,8 млн чалавек, з іх 1,1 млн аддаюць перавагу наземнаму транспарту. Сёлета за дзевяць месяцаў у сталіцы ўжо перавезена звыш 540 мільёнаў пасажыраў, тады як за аналагічны перыяд мінулага года — 324 мільёны, а за студзень—верасень 2023-га — 285 мільёнаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### У тэму

### З акцэнтам на Азіяцкі рэгіён

Беларусь падпісала 47 пагадненняў з іншымі краінамі па пытаннях, якія датычацца аўтамабільных перавозак як пасажыраў, так і грузаў. У кастрычніку падпісана пагадненне з Аманам, уступае ў дзеянне ратыфікаванае пагадненне з Пакістанам. Вядзецца адпаведная работа з калегамі з Саудаўскай Аравіі, ААЭ, Катара, Ірака, Кувейта, а таксама іншых дзяржаў.

Асноўная задача — забяспечыць беларускіх перавозчыкаў дастатковай колькасцю дазволаў. Для гэтага праводзяцца пасяджэнні змешаных камісій, дзе разглядаецца павелічэнне квот, дазволаў. У цэлым аўтамабільныя перавозчыкі дастойна спраўляюцца з выклікамі на знешнім контуры. Асноўная работа праецыруецца на краіны Азіяцкага рэгіёна.


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона: **ЗАО «Оценка Сервис»,** УНП 491382947

Продавец: **ОАО «РАЙБЫТУСЛУГИ» г. Калинковичи,** УНП 490792014, в лице ликвидатора

**Торги состоятся 24 ноября 2025 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества с НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка с НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** расходы по изменению границ земельного участка, необходимого для обслуживания объекта, приведение в надлежащий вид всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода прав на объект возлагается на Покупателя. Покупатель возмещает расходы по предпродажной подготовке в сумме: 420,00 бел. руб. | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 333/С-59222**, площадью **183,1 кв. м,** назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание комплексного приемного пункта.** Адрес: Гомельская обл., Калинковичский р-н, Шиичский с/с, аг. Шиичи, ул. Шоссейная, 8. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером 322387003601000161 общей площадью **0,0339 га.** Право аренды. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания здания комплексного приемного пункта. **В состав лота входит:** оборудование – 36 ед., товары – 24 наименования. | **32 358,64** | **3 235,86** |

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: 8 (029) 690-00-10 – ликвидатор Беланов Руслан Николаевич.**

Шаг аукционных торгов – 5 (пять)%.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ЗАО «Оценка Сервис»):** р/с BY94 BPSB 3012 3353 2001 9933 0000, в ОАО «Сбер Банк» г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 491382947, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**. Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса».

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 23 октября 2025 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 21 ноября 2025 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; оплатить вознаграждение в размере **8 %** от цены продажи, возместить затраты по газете в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи не позднее **10 (десяти) рабочих дней** со дня проведения торгов; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи не позднее **30 (тридцати) календарных дней** со дня проведения торгов.

Подробный перечень имущества, порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайте Организатора торгов – **www.ocenkaservis.by** в разделе Аукционы-«Очные торги».

Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. Постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона:**
**(тел./факс) 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.**
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

# КАМФОРТ ДЛЯ

## Як КУП «Гроднааблдарбуд» вось ужо

**Даволі важкай можна назваць дарожную карту апошніх гадоў. Амаль ніводзін знакавы аб'ект Гродзенскай вобласці не абышоўся без удзелу прадпрыемства — гэта і будаўніцтва БелАЭС, і кальцавая магістраль абласнога цэнтра, і рэканструкцыя мастоў праз Нёман, і развіццё турыстычных зон Аўгустоўскага канала. З апярэджаннем графіка выкананы ўсе пяць мэтавых паказчыкаў дзяржпраграмы «Дарогі Беларусі». Між тым планаў не становіцца менш.**



Генеральны дырэктар Сяргей СЛІНКО.



Рэканструяванай вуліцай Соф'і Панковай парадавалі жыхароў Ваўкавыска да «Дажынак».

Аб тым, як будзе развівацца дарожная сетка ў найбліжэйшы час і што зроблена сёлета, — у інтэрв'ю **генеральнага дырэктара КУП «Гроднааблдарбуд» Сяргея СЛІНКО.**

**— Сяргей Віктаравіч, на абласной сесіі дэпутатаў па абмеркаванні бюджэту на 2026 год важнае месца адведзена дарожным праектам...**

— Праект бюджэту падрыхтаваны, згодна з ім плануецца павелічэнне фінансавання ў адпаведнасці з каэфіцыентам інфляцыі. Гэта значыць, што будзе ўлічаны дадзены паказчык, каб не зменшыць аб'ёмы работ.

**— Магчыма, ёсць планы, якім чынам будуць размеркаваны сродкі?**

— Ідзе актыўная фаза работы па накіраванні бюджэтных сродкаў на тыя ці іншыя дарожныя аб'екты. Канчаткова яны будуць сфарміраваны пасля восеньскіх аглядаў, калі кожная дарога атрымае адпаведную ацэнку стану. Вынікі прааналізуюцца і пры неабходнасці будуць прымацца дадатковыя рашэнні па рамонце той ці іншай дарогі. Тады наш план прыме канчатковы выгляд. Гэта лістапад-снежань.

**— Ці дабаўляюцца з цягам часу новыя кіламетры дарог або, можа, наадварот, нейкія наогул знікаюць?**

— Так, гэты працэс нельга назваць застылым. Але дарогі не знікаюць. Тут іншая асаблівасць. Нейкія ўчасткі перадаюцца нашаму прадпрыемству, штосьці мы перадаём іншым арганізацыям. Такая рэарганізацыя працуе на карысць карыстальнікаў дарог. Напрыклад, нядаўна мы прынялі на баланс дарогу ў Навагрудскім раёне, якая вядзе да аднаго з населеных пунктаў, у той самы час мы перадалі дарогу-дублёра леснікам. Тым больш яна якраз па большай частцы ідзе праз лес.

**— Важным кірункам у рабоце з'яўляецца дзяржаўная праграма «Дарогі Беларусі». Сёлета завяршаецца чарговы пяцігадовы этап і пачынаецца новы. Што ён прадугледжвае ў канцэптуальным плане?**

— Новы этап будзе разлічаны на 2026—2030 гады. За гэты час мы павінны адрамантаваць без малога дзве з паловай тысячы кіламетраў дарог, што складае амаль пятую частку ад усіх дарог, якія знаходзяцца на балансе прадпрыемства. Пад гэта разлічана фінансаванне дзяржаўнай праграмы, што сведчыць аб тым, якое важнае значэнне надаецца ў Беларусі якасным дарогам, іх надзейнай эксплуатацыі і стану. Фінансаванне за апошнія некалькі гадоў значна вырасла.

**— Якім чынам вялося асваенне сродкаў вашым прадпрыемствам?**

— Калі раней за год мы маглі адрамантаваць 200—250 кіламетраў, то за 2024-ы — адразу 500, і планка не зніжаецца — наадварот, расце. Зразумела, што павелічэнне аб'ёмаў спрыяе і росту заработнай платы. На сёння сярэдні заробак складае 2 тысячы 557 рублёў. Мы з 2023 года на 300—400 рублёў павялічваем выплаты. І сёлета таксама будзе павелічэнне прыкладна на 500 рублёў.

**— Зразумела, што прадпрыемства не стаіць на месцы і ў плане павелічэння асноўных фондаў. Без гэтага дасягнуць высокіх вынікаў было б складана. Шмат сродкаў траціцца на набыццё тэхнікі?**

— Тэхнічнае забеспячэнне — важны складнік работы прадпрыемства «Гроднааблдарбуд». Так, летась на абнаўленне тэхнічнага парка выдаткавалі каля 12 мільёнаў рублёў. Гэта дазволіла нам набыць новы асфальтава-бетонны завод, некалькі асфальтаўкладчыкаў і каткоў, пагрузчыкі, аўтатранспарт. Толькі сёлета закуплена і паступіць больш за 40 адзінак тэхнікі. Стараемся выкарыстаць і ўласныя сродкі, і крэдытныя, і лізінгавыя лініі. Ёсць дапамога і з пазабюджэтнага фонду Гродзенскага аблвыканкама. Адтуль мы атрымалі амаль мільён рублёў.

**— Дарогі заўсёды запатрабаваны, асабліва прыемна, калі яны з добрым пакрыццём. На гэта, як відаць, скіравана і работа вашага прадпрыемства?**

— Можна прывесці такія лічбы. За пяць гадоў мы адрамантавалі чвэрць нашых дарог, у наступныя пяць гадоў — яшчэ столькі, што складае палову нашай дарожнай сеткі. Між тым за гэты час наспела неабходнасць звярнуць увагу і на тыя, што рамантавалі 10 гадоў таму. Праз гэты тэрмін пакрыццё трэба мяняць, бо яно з цягам часу зношваецца. Таму працэс па іх догляду няспынны. У лістападзе плануем здаць усе аб'екты, якія запланаваны на гэты год.

Да свайго прафесійнага свята падыходзім з добрымі вынікамі. У сувязі з гэтым асаблівая падзяка ўсяму працоўнаму калектыву, які дабіваецца высокіх вытворчых поспехаў на карысць свайго краю і ўсёй Беларусі.

## «НЕ БАІМСЯ БРАЦЬ СКЛАДАНЫЯ АБ'ЕКТЫ»

### Спецыялісты КУП «Гроднадарпраект» скіраваны на самыя адказныя задачы




**Намеснік дырэктара — галоўны інжынер Ірына АЎРУКЕВІЧ абмяркоўвае праектныя рашэнні з работнікамі прадпрыемства. Злева направа: інжынеры-праекціроўшчыкі Таццяна АЛЯКСЕЙЧЫК і Крысціна КОЗІК, галоўны інжынер праекта аддзела праектавання аўтамабільных дарог Ягор КАНЕЦКІ, галоўны інжынер праекта аддзела праектавання штучных збудаванняў Аляксандр НАСОВІЧ, інжынеры-праекціроўшчыкі Дзмітрый ЖДАНКО, Максім ГІВІЛЬ, Наталля ЖУК і Юлія САК.**

У праектным бюро пануе асаблівая атмасфера. Менавіта адсюль пачынаецца шлях ад ідэі да яе канчатковага вырашэння. Увесь працэс адлюстраваны ў чарцяжах, якіх набіраецца не адзін дзясятак. Дарэчы, новая аргтэхніка дазваляе друкаваць чарцяжы любога фармату, у тым ліку каляровыя.

Намеснік дырэктара — **галоўны інжынер Ірына АЎРУКЕВІЧ** дэманструе праектныя работы свайго прадпрыемства, якія рэалізаваны ў Ваўкавыску да абласных «Дажынак». Самым важным можна назваць рэканструкцыю вуліцы Соф'і Панковай, праект якой ажыццявіў **Ягор Канецкі.**

— Магістраль, што праходзіць праз Ваўкавыск, кардынальна змянілася. Мы прапанавалі варыянт, які дазволіў значна разгрузіць многія праблемныя месцы. Кожны ўчастак дарогі мае свае рашэнні — аб'екты асвятлення, інжынерныя сеткі, тратуары, стаянкі, разваротныя кольцы. Толькі на гэту дарогу сабрана тры папкі чарцяжоў. Работа вялася амаль паўгода. Было прапанавана некалькі варыянтаў. Урэшце адобрылі вельмі прыгожы і разам з тым аптымальны праект, які рэалізавалі нашы дарожнікі, — тлумачыць Ірына Браніславаўна.

Суразмоўніца ўпэўнена ў прафесійных здольнасцях свайго калектыву і не баіцца даручаць складаныя задачы. А «дажыначныя» аб'екты якраз з ліку даволі адказных. Як, напрыклад, рэканструкцыя моста праз раку Рось. Работа на ім вялася кардынальным чынам, а падрыхтаваў праект **Аляксандр Насовіч.** Дзякуючы правільнай дакументацыі, праблем з будаўніцтвам не ўзнікала — усё ішло згодна з планам.

— Мост быў на кантролі губернатара Гродзенскай вобласці Юрыя Караева, — падкрэсліла Ірына Браніславаўна. — Праектаваць яго мы пачалі ў 2024 годзе. Мянялі апорныя часткі, палі. Работы вяліся хутка. Калі што было незразумела, нашы спецыялісты выязджалі на месца і ўвогуле пастаянна суправаджалі будаўніцтва.

На чарзе — работа ў будучай сталіцы абласных «Дажынак» — Карэлічах. У хуткім часе геадэзісты будуць выязджаць на месца і прыступаць да работы. Тут у праграме тры праекты — дзве вуліцы і асвятленне.

## МАГІСТРАЛЬ: ПРЫГАЖОСЦЬ І БЯСПЕКА

### Як змянілася цэнтральная вуліца Ваўкавыска да свята хлебаробаў



Пад кіраўніцтвам начальніка ДРБУ-188 Сяргея ПЕСНЯКА былі ўзведзены чатыры новыя аўтапавільёны па вуліцы Соф'і Панковай.

# ТРАНСПАРТНЫХ ПАТОКАЎ

## 81 год рэалізоўвае маштабныя праекты ў рэгіёне



Дарожныя працоўныя Андрэй НАМЕЙКА і Аляксандр ДАЎГОЎСКІ ўстанаўліваюць дарожныя знакі падчас капітальнага рамонту дарогі Шчучын — Дэмбрава.

### НАША ДАВЕДКА:

*КУП «Гроднааблдарбуд» за дзевяць месяцаў з пачатку года адрамантавала і ўвяло ў эксплуатацыю 377 кіламетраў дарог і чатыры масты. Да канца года плануецца адрамантаваць яшчэ не менш за 150 кіламетраў. Заданне дзяржпраграмы на пяцігодку будзе перавыканана больш чым на 500 кіламетраў. З пачатку года набыта машын і абсталявання амаль на 6 мільёнаў рублёў.*



Намеснік генеральнага дырэктара Уладзімір ЦЫЛЬКО.

*Найлепшых паказчыкаў у 2025 годзе дасягнулі ДРБУ-188 Ваўкавыскага раёна (начальнік Сяргей Пясняк), ДРБУ-189 Навагрудскага раёна (начальнік Андрэй Марцута), ДРБУ-208 Мастоўскага раёна (начальнік Станіслаў Мусатаў).*

*А ўсяго на балансе прадпрыемства «Гроднааблдарбуд» 10,5 тысячы кіламетраў дарог рэгіёна і 412 мастоў.*

## УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА З ДАРОГІ...

### Так лічаць ветэраны працы і маладыя спецыялісты ДРБУ № 161 горада Шчучына

Менавіта на дарожных работах удалося сустрэцца адразу з некалькімі пакаленнямі работнікаў раённага філіяла прадпрыемства «Гроднааблдарбуд». Разам з маладымі кадрамі працуюць вопытныя спецыялісты. У іх ліку — **прараб Наталля СМЫСЛОВА.** У яе працоўнай кніжцы толькі адзін запіс — ДРБУ № 161, які зроблены амаль 40 гадоў таму. Наталля Юр'еўна кажа, што гэту прафесію выбрала свядома, скончыла ў свой час Гомельскі дарожна-будаўнічы тэхнікум. На першы ўчастак прыйшла ў 19 гадоў, паступова набіралася вопыту.

— Тут галоўнае — ведаць справу і не баяцца вучыцца. Многае дапамаглі асвоіць старэйшыя работнікі. Напрыклад, у мяне быў настаўнікам прараб Анатоль Барташэвіч, які многаму навучыў, а сёння я ўжо і сама магу даваць парады, — заўважае суразмоўніца.

Узнікае пытанне: у чым прыцягненне гэтай справы?

—Дарога—пастаянны рух,—усміхаецца Наталля Смыслова. — І мне гэта вельмі падабаецца. Прыемна потым бачыць вынік сваёй працы, ехаць і ведаць, што ты прынёс карысць людзям. Бо дарогі для ўсіх. І мая праца на вачах ва ўсіх, таму важна не дапускаць ніякіх хібаў і недарэчнасцяў. А самы прыемны момант, калі завяршаеш аб'ект: ставяцца знакі, добраўпарадкоўваецца прыдарожная тэрыторыя.

Дарэчы, участак дарогі, дзе адбылася сустрэча з даволі высокім рухам, злучае аграгарадок з раённым цэнтрам. Як расказаў **начальнік ДРБУ № 161 Генадзь ЗАЛОГА,** якраз тут ішлі работы па замене гравійнага пакрыцця асфальтабетонным. Паралельна вялася ўстаноўка знакаў і добраўпарадкаванне тэрыторыі. Дарэчы, на адхонах з граблямі працавалі практыканты, якіх у далейшым мяркуюць запрасіць на работу ў шчучынскі філіял.

— Аб'ёмы растуць, у параўнанні з мінулым годам рост склаў больш за 134 %, — паведаміў начальнік філіяла. — Таму важна павялічваць кадравы патэнцыял. Калі да нядаўняга часу ў нас працавалі 82 чалавекі, то на сёння — ужо 120. Таксама значна абноўлены асноўныя сродкі. Сёлета на гэтыя мэты выдаткавана 1 мільён 700 тысяч рублёў. Рост заработнай платы ў параўнанні з мінулым годам склаў 134 %.

За якасцю работ сочыць **галоўны інжынер Анатоль МІШЧУК,** які літаральна нядаўна працуе на пасадзе. Па яго словах, менавіта дзякуючы сучаснай тэхніцы ўдалося дабіцца большай роўнасці пры ўкладцы асфальту, працаваць без дэфектаў і больш хуткімі тэмпамі.





Аб'яднанне мудрасці старэйшага і энергіі маладзейшага пакаленняў даюць магчымасць ствараць дарогі лепшай якасці. На фота абмяркоўваюць рабочыя пытанні начальнік ДРБУ–161 Генадзь ЗАЛОГА, прараб Наталля СМЫСЛОВА і галоўны інжынер Анатоль МІШЧУК.

## ПРАРАБ, ЯКОГА ВЕДАЕ ЎВЕСЬ ФІЛІЯЛ

### Менавіта так можна назваць старшыню прафкама Алега БУСЛОВІЧА

А працуе ён на Ваўкавыскім ДРБУ № 188 вось ужо 34 гады, з іх 25 узначальвае мясцовую прафсаюзную арганізацыю. Мы сустракаемся на яго працоўным месцы — асфальтабетонным заводзе. Гэта адзін з самых ажыўленых пунктаў філіяла, бо работа тут ідзе няспынна. У сярэднім вырабляецца 400—450 тон асфальту за суткі.



Ветэран працы, прараб асфальтабетоннага завода Алег БУСЛОВІЧ.

Алег Баляслававіч па жыцці актыўны. Мабыць, таму і выбіраюць яго з году ў год старшынёй прафкама.

— З кожным нашым работнікам мы амаль штодня сустракаемся, мяне добра ведаюць, і я ўсіх ведаю. Прыходзяць са сваімі праблемамі, стараемся аказаць дапамогу, у тым ліку і матэрыяльную. Па жаданні забяспечваем абанементамі ў фізкультурна-аздараўленчы комплекс. Ездзім на экскурсіі, у найбліжэйшы час запланавана паездка ў Брэст, — расказаў Алег Бусловіч.

І гэта далёка не ўсе бонусы ад прадпрыемства. Так, да Дня Перамогі і Дня Незалежнасці выплачваюцца абавязковыя прэміі ўсім работнікам. У сваю чаргу, старшыня прафкама імкнецца наладзіць работу такі чынам, каб пазбегнуць няшчасных выпадкаў на вытворчасці. З гэтай мэтай штогод праводзіцца конкурс на найлепшае працоўнае месца. І задзейнічаны ў ім увесь калектыў — больш за 60 чалавек. Вядома, ёсць і заахвочванні. За першае месца — тры базавыя велічыні, за другое — дзве, за трэцяе — адна. Цяпер калектыў на чале са старшынёй прафкама рыхтуецца да 60-годдзя філіяла і свайго прафесійнага свята — Дня дарожніка.

Па словах **начальніка дарожна-рамонтнага будаўнічага ўпраўлення № 188 Сяргея ПЕСНЯКА,** падрыхтоўку да абласных «Дажынак» тут пачалі яшчэ летась з рамонту вулічных сетак. Работа працягвалася і сёлета. Разам з тым пачаўся і самы маштабны праект па рэканструкцыі асноўнай гарадской магістралі — вуліцы Соф'і Панковай працягласцю амаль два кіламетры. Падчас работы было асвоена звыш чатырох мільёнаў рублёў.

— Гэта галоўная скразная артэрыя горада, — заўважае Сяргей Пясняк. — Таму работы вяліся сур'ёзныя, былі прыцягнуты і сілы суседніх філіялаў. Ішла замена інжынерных сетак, камунікацый, з'явіліся новыя ліхтары, святлафоры, тратуары, агароджы, астраўкі бяспекі для пешаходаў.

Цяпер гэта вуліца — адна з самых прыгожых і бяспечных у горадзе. І хоць яе рэканструкцыя ўнесла пэўныя карэктывы ў рух транспартнага патоку, дарожнікі ўклаліся ў планавыя тэрміны. На пачатку жніўня дарога была здадзена, а ў верасні прымала гасцей абласных «Дажынак».

Сёння ДРБУ № 188 працуе на трох аб'ектах Ваўкавыскага раёна, якія можна назваць ажыўленым у плане транспарту.

## МОСТ ЗМЯНІЎ АБЛІЧЧА

### Аб'ект перыферыйны, але важны

Менавіта на гэтым факце засяродзіў увагу **галоўны інжынер КУП «Гроднааблдарбуд» Аляксандр МАРЦУЛЕВІЧ.** Знаходзіцца аб'ект у Шчучынскім раёне, непадалёк ад райцэнтра, і праходзіць праз невялікую рачулку Тураўку. Раней тут была гравійка, а сам мост даволі вузкі, негабарытны. Пракладваўся ён падчас знаходжання тут ваеннай часці і з цягам часу страціў сваё стратэгічнае значэнне.

Між тым былыя ваенныя аб'екты сталі ўцягвацца ў гаспадарчую дзейнасць, прамысловая зона расце. Да таго ж паблізу знаходзіцца аграгарадок Дэмбрава.

— Такім чынам, дарожнікамі сумесна з мясцовымі ўладамі было прынята рашэнне зрабіць капітальны рамонт моста і пракласці нармальную дарогу да населенага пункта, — паведаміў Аляксандр Марцулевіч. — І вось сёлета мост праз Тураўку ўведзены ў строй. Таксама заасфальтавана паўтара кіламетра гравійкі.

Цяпер мост стаў значна шырэйшы і забяспечвае інтэнсіўны рух транспарту. Мостам карыстаюцца і самі дарожнікі для перавозкі кар'ерных выкапняў, каб будаваць новыя якасныя дарогі.




Першы намеснік генеральнага дырэктара — галоўны інжынер Аляксандр МАРЦУЛЕВІЧ дэманструе вынік капітальнага рамонту моста цераз раку Тураўку ў Шчучыне.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Лізаветы ГОЛАД.**

УНП 500036511

**Паважаныя калегі!**

*Прыміце самыя шчырыя віншаванні з прафесійным святам —*

**ДНЁМ АЎТАМАБІЛІСТА І ДАРОЖНІКА!**

*Дзякую вам за цяжкую і неацэнную працу на дарожных магістралях краіны. Незалежна ад пары года, пераменлівага надвор'я вы заўсёды знаходзіцеся на пасту, ствараеце сапраўдны цуд — надзейныя шляхі, якія яднаюць гарады, людзей, мары. Жадаю ўсім моцнага здароўя, невычэрпнай энергіі, дабрабыту, натхнення, удачы і цярпення. Няхай жыццёвы шлях будзе роўным і светлым, а работа прыносіць задавальненне і радуе вынікамі.*

**Генеральны дырэктар КУП «Магілёўаблдарбуд» Ігар ЗУСМАНАЎ.**



*Моцныя рэгіёны — стратэгія, якой кіруецца Беларусь у развіцці. І дарогі — адзін са складнікаў вялікага плана дзеянняў. Яны павінны быць надзейнымі і зручнымі. Напярэдадні Дня аўтамабіліста і дарожніка мы пагутарылі са спецыялістамі, ад якіх залежаць стан і перспектывы транспартнай сеткі Магілёўскай вобласці менавіта ў сельскай мясцовасці.*

# ПА АРТЭРЫЯХ

## Прадпрыемства «Магілёўаблдарбуд» клапоціцца, каб мясцовыя дарогі былі больш функцыянальнымі

Летась дзеля развіцця сеткі рэспубліканскіх аўтамабільных дарог і фарміравання транспартнай інфраструктуры Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка паставіў перад дарожнікамі задачу наладзіць якасную дарожную сувязь паміж райцэнтрамі і аграгарадкамі, каб забяспечыць гадзінную даступнасць да гарадоў-спадарожнікаў. І, як запэўніў генеральны дырэктар КУП «Магілёўаблдарбуд» Ігар Зусманаў, гэта даручэнне ў Магілёўскай вобласці цалкам выканана.

— Усе аграгарадкі рэгіёна на сёння маюць транспартную сувязь з райцэнтрамі і рэспубліканскімі аўтамабільнымі дарогамі, — падкрэсліў Ігар Міхайлавіч. — Гэта работа вялася не першы год. За пяцігодку зроблена каля 51 кіламетра ўдасканаленага пакрыцця на гравійных участках пад'язных дарог ад райцэнтраў да аграгарадкоў. Дзяржава рацыянальна глядзіць на развіццё дарожнай галіны і плануе на пяцігодкі. Выдзяляецца пэўная сума фінансаў, якая з кожным годам узрастае. Акрамя сродкаў, выдзяляецца і тэхніка. Абнаўляем аўтапарк і набываем новыя асфальтабетонныя ўстаноўкі (АБУ). Сёлета асноўнай мэтай АБУ наш касцюковіцкі філіял. Прапрацоўваем набыццё яшчэ адной для Бабруйскага раёна. На чарзе — Круглае, Магілёўскі раён. Шчыльна працуем па інвестпраектах з «Белінвестбанкам».

**— Якія аб'ёмы работ выканалі сёлета і які матэрыял пры гэтым выкарыстоўваўся?**

— За 9 месяцаў зроблены рамонт болей чым 460 кіламетраў пакрыцця мясцовых аўтадарог вобласці, што ў 1,2 раза перавышае даведзены гадавы паказчык дзяржпраграмы «Дарогі Беларусі». Перавыкананы і намечаны рэспубліканскім планам аб'ём рамонту дарожнага пакрыцця — 405 кіламетраў. Асноўныя віды работ — рамонт існуючых удасканаленых пакрыццяў з найбольшай інтэнсіўнасцю руху і ўладкаванне больш узмоцненага пакрыцця на гравійных дарогах. Выкананы капрамонт двух аб'ектаў у Магілёўскім раёне з прымяненнем тэхналогіі «Вайттопінг». Яна дазваляе ўдасканаліць танкаслойнае дарожнае пакрыццё з цэментнай сумесі на існуючым асфальтабетонным пакрыцці. Яшчэ на некалькіх аб'ектах у Магілёўскім і Чавускім раёнах на гравійных участках зроблена цэментнае пакрыццё.

**— Дарогі павінны быць не толькі трывалыя, але і бяспечныя...**

— Так. У адпаведнасці з планам мерапрыемстваў па павышэнні бяспекі дарожнага руху ў Магілёўскай вобласці ў шэрагу аграгарадкоў устаноўлены сігнальныя слупкі, пешаходныя агароджы, штучныя няроўнасці, новыя дарожныя знакі. Напярэдадні новага навучальнага года абнавілі гарызантальныя разметкі і зрабілі штучныя няроўнасці паблізу 126 устаноў адукацыі.

**— Развіццю аўтамабільных дарог, у тым ліку мясцовых, у краіне ўдзяляецца вялікая ўвага. Ці атрымліваецца трымаць тэмп?**

— Мы ўжо на пяць гадоў наперад ведаем, што будзем рабіць. Дзяржава працуе ў гэтым кірунку выразна і дынамічна. Яно і зразумела: дарогі — гэта артэрыі краіны. Калі іх дзесьці няма, тэрыторыя адмірае. Наша задача — зрабіць так, каб агульны «арганізм» якасна функцыянаваў нават у самых маленькіх аддаленых куточках.



Маладыя спецыялісты прадпрыемства за працай: інжынеры-праекціроўшчыкі Алена ГУНЕВА, Марыя МАЛАШЭНКА, Максім МАНГУТАЎ і Мікіта КАМАРОЎ.

## МОЛАДЗЬ ГАНАРЫЦЦА ПРАФЕСІЯЙ

Уласнае праектнае бюро дазваляе прадпрыемству не толькі сябе забяспечваць неабходнай для будаўніцтва і абслугоўвання дакументацыяй, але і аказваць у гэтым паслугі іншым. Побач з вопытнымі прафесіяналамі працуюць і пачынаючыя спецыялісты, якія за свой зусім яшчэ невялічкі стаж паспелі ўжо паўдзельнічаць у важных для вобласці праектах. Інжынеры-праекціроўшчыкі Алена Гунева, Максім Мангутаў, Мікіта Камароў, Марыя Малашанка з іх ліку.

Алена Гунева, якая працуе ў праектнай брыгадзе № 1 крыху болей чым год, праектавала арганізацыю дарожнага руху на ўчастку вуліцы Раўчакова ў Магілёве, дзе сёлета быў устаноўлены помнік мірным ахвярам фашыстаў, удзельнічала ў праектаванні добраўпарадкавання тэрыторыі ў раёне папулярнага ў магілёўчан Святога возера. Паралельна актыўная дзяўчына ўзначальвае пярвічку БРСМ на прадпрыемстве.

Максім Мангутаў займаецца штучнымі збудаваннямі — праектуе масты, трубы.

— Калі вучыўся, лічыў, што мая спецыяльнасць — дарогі, навошта масты вывучаць? — усміхаецца хлопец. — Але так атрымалася, што трэба. Ужо ўцягнуўся і задаволены, што займаюся менавіта мастамі. Дарэчы, мой дзядуля Даджы Раманавіч падчас вайны будаваў масты.

А вось Мікіта Камароў натхніўся прыкладам маці, якая працуе ў праектным бюро галоўным інжынерам. «Мне яшчэ ў школе падабалася чарціць, таму стаў прадаўжальнікам дынастыі», — аргументуе ён.

Па праектах Марыі Малашанкі пабудаваны дзіцячыя пляцоўкі ў Магілёве і райцэнтрах.

— Марыла стаць інжынерам-праекціроўшчыкам, каб бачыць вынік сваёй работы: ад думкі да ўвасаблення, — прызналася яна.

## КАДРЫ ВЫРАШАЮЦЬ УСЁ

У цэнтральным офісе прадпрыемства на вуліцы Карла Маркса ў Магілёве можна ўбачыць выстаўку дзіцячых малюнкаў на дарожную тэматыку. Гэта малявалі дзеці тутэйшых работнікаў. Падлеткі дэталёва перадалі асаблівасці прафесіі. Магчыма, хтосьці з іх аднойчы таксама прыйдзе сюды працаваць.

Сем'ям тут наогул удзяляецца асаблівая ўвага. На сёння ў «Магілёўаблдарбудзе» працуе каля 40 дынастый. Тут ганарацца поспехамі ветэранаў і тых, хто стварае прыгожае сёння. Такімі, як Вікенцій Пяменавіч Самусеў і Васіль Афанасьевіч Лапацін, якія былі ўдастоены знака «Ганаровы дарожнік». Каля 80 работнікаў прадпрыемства з'яўляюцца ўладальнікамі знака «Ганаровы дарожнік» I і II ступеняў.

**Намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце Сяргей Феакціставў** расказвае, што для ўмацавання калектыву штогод у канцы верасня ладзіцца трохдзённае сямейнае спартыўнае свята. Сёлета тут пабывала каля 460 работнікаў з усёй вобласці. Шмат увагі аддаецца падрыхтоўцы маладых спецыялістаў.

— Працуем над мэтавым наборам, — кажа Сяргей Міхайлавіч. — У калектыўным дагаворы замацавалі, што будзем плаціць дадатковую стыпендыю яшчэ і ад прадпрыемства. Два гады таму распрацавалі Палажэнне аб настаўніцтве, каб маладыя людзі больш арганічна ўліваліся ў калектыў. Сёлета для маладых спецыялістаў зрабілі экскурсію ў «Белдарцэнтр», дзе яны наведалі музей і даведаліся, як развівалася галіна. Відавочны плюс — арэндная жыллё. На яго могуць прэтэндаваць маладыя спецыялісты, якія працуюць на раёнах.



Дарожны рабочы Андрэй АФОНІН укладвае асфальтабетоннае пакрыццё.



Укладка асфальту ў Клімавіцкім раёне.

ДА ВЕДАМА

У склад буйнога вытворчага аб'яднання «Магілёўаблдарбуд» сёння ўваходзяць КУП «УТПК-Аблдарбуд» і 22 філіялы, дзе працуюць 1560 чалавек розных прафесій: ад ІТР-спецыялістаў да дарожных рабочых. На абслугоўванні прадпрыемства знаходзіцца 10,5 тысячы кіламетраў дарог. Утрымліваць іх у рабочым стане дазваляе 640 адзінак будаўніча-дарожнай тэхнікі, транспарту і абсталявання. І аўтапарк пастаянна абнаўляецца. На сёння на гэтыя мэты пайшло болей чым 5699 тысяч рублёў.

# ЖЫЦЦЯ



Намеснік начальніка аддзела механізацыі Вадзім ГУДОВІЧ, начальнік ДРБУ № 130 Сяргей ШАЎЦОЎ і майстар АБЗ Аляксандр КАНАНКОЎ абмяркоўваюць увод у эксплуатацыю новага асфальтабетоннага завода ў Касцюковічах.



Варшчык асфальтавай масы Дзмітрый ХОЦЕЛЕЎ кантралюе працэс выпуску асфальту ў аператарскай.





## РАМАНТЫКА МЯСЦОВЫХ ДАРОГ

ДРБУ-130 — касцюковіцкі філіял «Магілёўаблдарбуда», які абслугоўвае яшчэ і Краснапольскі раён. Яго аб'екты бываць таксама ў Хоцімскім і Клімавіцкім раёнах. Кіруе арганізацыяй прафесіянал сваёй справы Сяргей Шаўцоў. Ён з ліку тых маладых людзей, якія дзе нарадзіліся, там і працуюць на карысць малой радзімы. На чале арганізацыі ён ужо дзесяць гадоў. І з задавальненнем кажа, што не памыліўся з прафесіяй.

— Пра тыя аб'ёмы работ, якія выконваем цяпер, дзесяць гадоў таму можна было толькі марыць, — расказвае ён. — Фінансаванне павялічылася ў разы. Раней у раёне па дарогах даводзілася «паўзці», цяпер едзеш як па рэспубліканскай трасе. За апошнюю пяцігодку асабліва шмат зроблена па мясцовай дарожнай сетцы, штогод абнаўляем па 35-40 кіламетраў дарог.

Малады кіраўнік вельмі даражыць раённым пераходным сцягам, які знаходзіцца ў арганізацыі ўжо другі год запар. Наогул, калектыў заслугоўваў яго ўжо тры разы. Першы раз ён быў уручаны ў 2019-м, потым вярнуўся ў 2023-м і застаўся на 2024 год.

На рахунку арганізацыі і асабіста кіраўніка шмат ганаровых грамат, падзяк, спартыўных узнагарод. Адчуваецца, што тут прывыклі быць першымі ва ўсім.

За дзесяць гадоў колькасць працаўнікоў у арганізацыі павялічылася з 44 чалавек да 102. Некаторыя прыводзяць за сабой родных. Услед за Сяргеем Шаўцовым сюды прыйшоў працаваць варшчыкам бітуму яго бацька. Маюць аўтарытэт у арганізацыі браты Мікалай і Дзмітрый Васілеўскія, сужэнцы Алеся і Андрэй Афоніны. З Андрэем Афоніным пагутарылі непасрэдна на працоўным месцы — падчас будаўніцтва дарогі ў Клімавіцкім раёне. Прызнаўся, што да прыходу ў ДРБУ-130 працаваў у Расіі. Але дома лепш. «Работа напружаная, але з калектывам пашчасціла», — удакладніў суразмоўнік.

Дарэчы, сярэдняя зарплата за студзень — верасень па ДРБУ-130 склала 2758 рублёў. Але, як заўважае начальнік, грошы трэба яшчэ зарабіць. Павысіць прадукцыйнасць працы дапамагае новая тэхніка і асфальта-бетонная ўстаноўка магутнасцю 130 тон/гадзіну, якая была закуплена сёлета па «чарнобыльскай» праграме. Для параўнання: на старой выраблялася 30 тон/гадзіну. Як працуе ўстаноўка, журналісты «Звязды» ацанілі на месцы. Сапраўды, ёсць чым ганарыцца. «Новая ўстаноўка — «казка». Няма пылу, кіраванне аўтаматызаванае», — задаволены **майстар Аляксандр КАНАНКОЎ,** які каардынуе тут работу.

— Дзякуючы новай АБУ, дарогу працягласцю два кіламетры мы робім за 4-5 дзён, а не тыдзень, як было раней, — рэзюмуе Сяргей Шаўцоў. — Збіраемся рабіць на ёй новыя болей зносастойкія сумесі — шчэбенева-масцікавыя. У зімовы перыяд каэфіцыент счаплення ў іх лепшы.

На тэрыторыі асфальтабетоннага завода ідзе мадэрнізацыя будынка, дзе размесціцца лабараторыя для кантролю якасці сумесяў, што выпускаюцца, і ўваходнага кантролю якасці матэрыялаў, якія паступаюць. Не трэба будзе вазіць усё гэта ў Магілёў у цэнтральную лабараторыю.

ДРБУ-130 паспявае не толькі сельскімі дарогамі займацца, але і зарабляе валюту на экспарце будаўнічых паслуг у Расіі. Сёлета, напрыклад, даход склаў 79 тысяч долараў у эквіваленце. Ёсць дамоўленасць аб супрацоўніцтве і на наступны год.



Загрузка матэрыялаў у бункеры.



Майстар па рамонце і будаўніцтве дарог Даніїл ЗАЙЦАЎ і вадзіцель пагрузчыка Аляксандр ЗАЙЦАЎ сочаць за выкананнем ухілу.



Заслужаны работнік прадпрыемства вадзіцель пагрузчыка Пётр ЧУБАНАЎ.

## КУРС НА ПАЎДНЁВЫ ЎСХОД

У журналістаў «Звязды» была ўнікальная магчымасць паназіраць і за тым, як істотна абнавілася дарога на самай усходняй ускраіне вобласці на ўчастку Хоцімск — Ліпаўка — Гаўрылаўка — граніца Расійскай Федэрацыі.

— Дарога стратэгічная, шмат расійскіх машын рухаецца па ёй у Касцюковічы на Беларускі цэментавы завод, — кажа Сяргей Шаўцоў. — Раней яна была гравійная, падчас дажджоў яе размывала. Сёлета мы падрыхтавалі аснову, паклалі два слаі асфальтабетону і цяпер займаемся адсыпкай абочын. Застанецца ўстанавіць пару знакаў, нанесці дарожную разметку — і работа будзе скончана. Працягласць — болей чым 3,5 кіламетра.

На месцы знаёмімся **з майстрам рамонтна-будаўнічага ўчастка ДРБУ-130 Даніїлам Зайцавым.** Сам ён родам з Оршы Віцебскай вобласці, сёлета прыехаў адпрацоўваць сюды пасля заканчэння Беларуска-Расійскага ўніверсітэта (БРУ).

— Мне тут вельмі падабаецца, — прызнаецца малады спецыяліст. — Цудоўны калектыў, жыллё арэнднае далі — аднапакаёўку. Наогул, Касцюковічы — сімпатычны ціхі гарадок, ёсць ФАК з басейнам, месцы, дзе можна адпачыць.

Начальнік новым супрацоўнікам таксама задаволены — талковы хлопец.

— У сакавіку мы паехалі ў БРУ, каб прэзентаваць перад выпускнікамі сваю арганізацыю, — кажа ён. — Паказалі нашы аб'екты, паведамілі пра зарплату, арэнднае жыллё. Даніїл зацікавіўся і прыехаў. Мы вельмі гэтаму рады.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Лізаветы ГОЛАД.**

УНП 700183484

СВЕТ КНІГ

# ТАЯМНІЦЫ ІСНАВАННЯ — У ДЭТАЛЯХ

Вандроўка па незнаёмым маршруце — выбар найперш тых, хто любіць адкрываць новае, умее арыентавацца ў любых абставінах і ніколі не страчвае інтарэсу да жыцця. А калі нам трапляецца цікавая кніга, то гэта якраз добрая магчымасць усё вышэйадзначанае знайсці пад адной вокладкай. Адзінае — пункты на карце ведае толькі аўтар, а чытачу выпадае нагода прайсці па іх у добрай кампаніі. У чарговай падборцы кніжных навінак Выдавецкага дома «Звязда» вы дакладна знойдзеце вартыя прапановы.

## ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТАЎ ВЫДАТНЫХ ЗЕМЛЯКОЎ



Сярод навінак таксама звяртае на сябе ўвагу кніга «Вядомыя людзі Беларусі ў партрэтах і нарысах» Ірыны Аўсеп'ян. У аснову яе пакладзены публіцыстычны праект газеты «СБ. Беларусь сегодня», прысвечаны асобам, якія зрабілі неацэнны ўнёсак у развіццё дзяржавы, культуры і літаратуры. Шматгранная дзейнасць кожнага з іх, а таксама знакавыя творы, прызнаныя класікай, сталі сімвалам бескарыслівага служэння Радзіме. І менавіта пра гэтых людзей распавядаецца ў нарысах Ірыны Аўсеп'ян. На старонках гэтай кнігі разам з аўтарам чытачы згадаюць Аляксея Дударава, Івана Навуменку, Васіля Шаранговіча, Кузьму Чорнага, Стэфанію Станюту і многіх іншых. Усе яны аб'яднаны служэннем беларускай культуры. «У вёсцы я чуў толькі беларускую мову. Вось чаму мне так запала яна ў душу і сэрца. Некаторыя дзівяцца: «Вы ніколі не вучыліся ў беларускіх школах, пражылі бадай усё жыццё за межамі Беларусі, а мову ведаеце». Як жа яе не ведаць, калі яна родная?» — так пачынаецца нарыс пра Уладзіміра Дубоўку, што адразу вельмі трапна характарызуе гэтага майстра слова, паэта, чые жыццё і лёс — як партрэт цэлага пакалення, якому выпала шмат выпрабаванняў і перамен. І кожны нарыс, партрэт у кнізе дае вельмі яркае ўяўленне пра людзей, якія згадваюцца ў іх. А мастак Алег Карповіч дапамагае яшчэ і «зазірнуць у вочы» героям кнігі.

## ЗАМАК З ПРЫГОДАМІ



Аднайменная аповесць Алены Гнявушавай знаёміць чытачоў з цікавай гісторыяй незвычайных прыгод. Тут у гераінь можа заказацца прывід, давядзецца сутыкнуцца са злодзеямі, а нянька можа аказацца вядзьмаркай і пры гэтым бацькі застануцца за сотні кіламетраў... Але як добра ўсё ў нашых блізнят пачыналася! Сёстры і падумаць не маглі, што вандроўка ў адзін з самых папулярных замкаў Англіі поўнасцю зменіць іх жыццё. І там ужо ад дарослых не дачакаешся дапамогі, таму дзяўчатам трэба самастойна праводзіць расследаванне, вучыць заклінанні, знаходзіць сяброў і адшукваць таемныя хады. А калі ўлічыць, што, верагодна, на замак накладзена заклятце, то застаецца толькі адно — пажадаць героям удачы!.. Дынамічны сюжэт, жывая мова і каларытныя героі дакладна не дадуць засумаваць вам і вашым дзецям.

**Алена ДРАПКО.**

## Надвор'е на заўтра

| | | |
|---|---|---|
| **МІНСК** 750 мм рт.сл. | +9..+11 °C | +10..+12 °C |
| **ВІЦЕБСК** 752 мм рт.сл. | +7..+9 °C | +10..+11 °C |
| **МАГІЛЁЎ** 752 мм рт.сл. | +8..+10 °C | +11..+12 °C |
| **ГОМЕЛЬ** 753 мм рт.сл. | +9..+11 °C | +11..+12 °C |
| **ГРОДНА** 746 мм рт.сл. | +9..+11 °C | +10..+12 °C |
| **БРЭСТ** 747 мм рт.сл. | +11..+13 °C | +10..+13 °C |

Паводле даных Белгідрамета

**Месяц**

*Маладзік 21.10–28.10. Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**




Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— нязначныя геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура

**...у суседзяў**

| | |
|---|---|
| **МАСКВА** | +8..+10 °C |
| **С.-ПЕЦЯРБУРГ** | +6..+8 °C |



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

## ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 240

5 кастрычніка ў сталічнай СДЮШАР па шахматах і шашках адбыўся турнір па шашках-64, прысвечаны 85-годдзю заслужанага майстра спорту Рэспублікі Беларусь Аркадзя Міронавіча Плакхіна. Перамог Павел Бокій. Сам юбіляр параненйшаму поўны сіл і рыхтуецца прыняць удзел у найвышэйшай лізе чэмпіянату краіны па шашках-64. Гэта для яго будзе ўжо 62-і чэмпіянат, у 15 з якіх А. Плакхін заваёўваў залаты медаль.

У канцы верасня ў РЦАП па шахматах і шашках адбыўся турнір першай лігі чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па шашках-100 сярод мужчын і жанчын. У мужчын спаборнічалі 23 шашысты. Па 10 ачкоў з 18 магчымых набралі майстар Рыгор Кулагін (Рэчыца), кандыдат у майстры Яўген Капусцін (Бабруйск), майстар Анастасія Сакалова і кандыдат у майстры Максім Крупкін (абодва Мінск). У турніры сярод жанчын гулялі 16 удзельніц. Упэўнена перамагла кандыдат у майстры Тацццяна Петрусёва (Мінск) — 12 ачкоў. На другім месцы майстар Ганна Барашка (Гомель), бронзавая ўзнагарода ў кандыдата ў майстры Алесі Масюк (Мінск), у абедзвюх па 10 ачкоў.

**№ 50** Т. Петрусёва — В. Дубініна

**Белыя простыя:** 43, 45, 36, 37, 38, 39, 40, 31, 34, 29, 24 (11)

**Чорныя простыя:** 27, 22, 25, 17, 18, 20, 13, 14, 15, 6, 8 (11)

**№ 51** Іваноў Р. — Капусцін Я.

**Белыя простыя**: 43, 44, 36, 37, 38, 39, 40, 33, 34, 35, 27, 28, 29, 23 (14)

**Чорныя простыя:** 26, 24, 25, 16, 19, 20, 11, 13, 14, 15, 8, 10, 2, 3 (14)

Белыя правялі ўдар 1. 37-31 26:37 2. 27-21 16:27 3. 23-18 13:22 4. 28:06, але наткнуліся на контркамбінацыю 27-32! 5. 38:27 19-23 6. 29:18 24-30 7. 35:24 20:49 і неўзабаве чорныя перамаглі.

**№ 52** Г. Буйліна — М. Атрошанка

**Белыя простыя шашкі:** 48, 42, 43, 45, 37, 38, 40, 32, 34, 35, 26, 27 (12)

**Чорныя простыя шашкі:** 23, 24, 16, 17, 18, 19, 12, 13, 14, 6, 9, 3 (12)

Белыя правялі ўдар і трапілі на пераддамачнае поле. Пакажыце камбінацыю.

**№ 53**



**№ 53** Віктар Шульга

**Белыя простыя:** c1, g5, d6, f6, c7, e7 (6)

**Чорныя простыя:** e3, g3, b4, h4, c5, b8, f8 (7)

№ 54 Азіз Бердар

**Белыя простыя:** c1, e1, d2, c3, g3, f4, a7 (7)

**Чорныя простыя:** f2, b4, h4, a5, d6, c7,d8 (7)

**№ 55** Іван Наўроцкі

**Белыя простыя:** c1, h2, c5, b6, d6, h6, c7, e7 (8)

**Чорныя простыя:** d2, c3, e3, d4, f4, a5, g5, g7, f8 (9)

**№ 56** Ілья Грамагласаў

**Белыя простыя шашкі:** 48, 50, 41, 31, 27, 29, 23, 24, 16, 19, 20 (11)

**Чорныя простыя шашкі:** 38, 32, 33, 26, 11, 13, 15, 7, 8, 9, 2 (11)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

***З лістоў чытачоў***

«Дзякуем аўтарам, вядучаму і рэдакцыі за ігравы матэрыял», — пішуць Ф. Карпей і Л. Жыхар.

Праверце свае рашэнні: выпуск № 239 ад 25.09.2025.

№ 43 1. g5-f6 h8:e5 2. d4:d8 b6:b2 3. a3:c1 a5:e1 4. d8:a5 e1-h4 5. g1-f2 h4:e1 6. c1-d2 e1:c3 7. a5:d2 d6-e5 8. d2-e3+

№ 44 1. b6-c7 d8:b6 2. c3-a5 e5:g3 3. a5:g7 h6:f8 4. h2:h6 b8-c7 5. h4-g5 c7-d6 6. g5-f6 d6-c5 7. f6-e7 f8:d6 8. h6-g7 c5-d4 9. g7-f8 d6-e5 10. f8-g7+

№ 45 1. 27-21 18:47 2. 50-45 47:50 3. 21-16 35:44 4. 16:18+

№ 46 1. 30-24 19:37 2. 28:10 37:39 3. 25:03 05:14 4. 03:07 02:11 5. 36-31+

№ 47 1. d2-e3 f4:b4 2. a3:e7 c7:a5 [ 2...d8:f6 3.b6:d8 ] 3. e7-f8 d8-c7+

№ 48 1. d2-e3 a7:c5 2. b4:h6 f4:b4 3. h6:h2 b4-c3 4. h2-g3 h4:f2 5. g1:e3+

№ 49 1. a5-b6 a7:c5 2. b4:h6 f4:b4 3. h6:h2 b4-c3 4. h2-g3 h4:f2 5. g1:e3+

Першымі дакладныя адказы даслалі: Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзель), І. Ананіч (Гродна), В. Арцюхін, Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі, (усе Мінск), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.).

Пішыце па адрасе: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

## 23 кастрычніка — Даты, Падзеі, Людзі




**1940** год — нарадзіўся Алег Парфіравіч Чудакоў (г. п. Сураж Віцебскага р-на), беларускі вучоны ў галіне сківічна-тварнай і пластычнай хірургіі, доктар медыцынскіх навук (1975 г.), прафесар (1977 г.), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1997). У 1964 г. скончыў Пермскі медыцынскі інстытут, дзе і працаваў. З 1980 г. у Беларускім медыцынскім універсітэце, з 1992 г. галоўны спецыяліст па сківічна-тварнай і пластычнай хірургіі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. Аўтар навуковых прац па метадах пластычнага аднаўлення вялікіх дэфектаў органаў твару і шыі, кампрэсійна-дыстракцыйным метадам остэасінтэзу костак шкілета твару. Заснавальнік і старшыня Беларускай асацыяцыі сківічна-тварных хірургаў.




**1875** год — нарадзіўся Гілберт Ньютан Льюіс, амерыканскі фізіка-хімік. У 1929 годзе ўвёў тэрмін «фатон». У 1933 годзе ўпершыню атрымаў цяжкую ваду і вылучыў з яе цяжкі ізатоп вадароду — дэйтэрый.

**1914** год — у Маскве адкрыта Шчукінскае тэатральнае вучылішча.

**1920** год — нарадзіўся Джані Радары, італьянскі пісьменнік, журналіст, выдавец, удзельнік руху Супраціўлення. Аўтар аповесцей-казак «Прыгоды Чыпаліна», «Блакітная страла», зборніка казачных навел «Гульня ў доміке».

**1930** год — нарадзіўся Алег Мікалаевіч Трубачоў, расійскі вучоны-мовазнаўца, спецыяліст у галіне славянскага мовазнаўства, акадэмік РАН (1992 г.). Аўтар работ у галіне этымалогіі славянскіх моў і ўсходнеславянскай анамастыкі. Пад яго кіраўніцтвам ажыццёўлена работа па стварэнню фундаментальнай лексікаграфічнай працы — 24-томнага «Этымалагічнага слоўніка славянскіх моў».

**1940** год — нарадзіўся Пеле (Эдсан Арантыс ду Насімэнту), легендарны бразільскі футбаліст. Адзіны сярод футбалістаў планеты трохразовы чэмпіён свету (1958 г., 1962 г., 1970 г.). У 2002 годзе прызнаны ФІФА найлепшым футбалістам планеты XX стагоддзя.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы несуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 560. Індэкс 63850. Зак. № 2210.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 22 кастрычніка 2025 года.